WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 СТУДЗЕНЯ 2012 г. СЕРАДА № 1 (27116)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Афіцыйна**

### БАЗАВАЯ ВЕЛІЧЫНЯ З 1 КРАСАВІКА 2012 ГОДА СКЛАДЗЕ BR100 ТЫС.

Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў №1785 ад 30 снежня 2011 года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе ўрада. Цяпер памер базавай велічыні — Br35 тыс.

### ГРАФІК ВЫПЛАТЫ ПЕНСІЙ СКАРЭКЦІРАВАНЫ Ў СУВЯЗІ СА СВЯТКАВАННЕМ КАЛЯД

**У Беларусі графік выплаты пенсій скарэкціраваны ў сувязі са святкаваннем праваслаўных каляд. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў РУП «Белпошта».**

Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 7 студзеня ў аддзяленнях паштовай сувязі (АПС) г. Мінска, Брэсцкай, Магілёўскай, Мінскай і сельскіх АПС Віцебскай абласцей будзе праводзіцца 4 студзеня, у АПС Гомельскай, Гродзенскай і гарадскіх АПС Віцебскай абласцей — 5 студзеня. У РУП «Белпошта» праінфармавалі, што 7 студзеня 2012 года будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі.

## СТАЎКА ПАДАТКУ НА ПРЫБЫТАК У 2012 ГОДЗЕ ЗНІЖАЕЦЦА З 24 ДА 18 ПРАЦЭНТАЎ

**Аб гэтым заявіў 30 снежня журналістам начальнік галоўнага ўпраўлення падатковай палітыкі і даходаў бюджэту Міністэрства фінансаў Беларусі Дзмітрый Кійко, паведамляе БЕЛТА.**

Дзмітрый Кійко пракаментаваў падпісаны 30 снежня закон аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Беларусі. «Гэта будзе самая нізкая стаўка падатку на прыбытак у Мытным саюзе і адна з самых нізкіх у краінах Усходняй Еўропы», — адзначыў ён. Зніжэнне стаўкі прадугледжана законам аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Беларусі, які падпісаны 30 снежня Прэзідэнтам. Гэтыя змяненні ўступаюць у дзеянне з 1 студзеня 2012 года.

У законе ўлічаны вынікі практычнага прымянення падатковага заканадаўства, Дырэктывы № 4, змяненні, якія адбыліся ў мытным заканадаўстве ў Мытным саюзе, а таксама звароты грамадзян і грамадскіх аб'яднанняў. Закон прадугледжвае шэраг мер. Гэта агульнасістэмныя меры, накіраваныя на зніжэнне падатковай нагрузкі, узмацненне інвестыцыйнага стымулявання і павышэнне на гэтай аснове канкурэнтаздольнасці эканомікі. «Дасягаецца гэта значным зніжэннем стаўкі падатку на прыбытак — з 24 працэнтаў да 18 працэнтаў», — адзначыў Дзмітрый Кійко.

Адначасова з гэтым падатковым заканадаўствам уводзяцца агульнапрынятыя механізмы стымулявання інвестыцыйнай дзейнасці. Гэта пашырэнне магчымасцяў па паскарэнні амартызацыйных актываў, таксама ёсць магчымасць пераносу страт будучага прыбытку на працягу 10 гадоў без колькасных абмежаванняў. Сукупнасць такіх галоўных падатковых мер забяспечыць у 2012 годзе зніжэнне падатковай нагрузкі прыкладна 0,4 працэнта да ВУП.

Зніжэнне падатковай нагрузкі прадугледжана ў адносінах да малога і сярэдняга бізнэсу, падкрэсліў прадстаўнік Мінфіна. Для гэтага стаўка падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання зніжаецца ў межах 1 працэнтнага пункта і будзе складаць 7 працэнтаў замест 8 працэнтаў раней дзеючых. Дадаткова закон прадугледжвае пашырэнне падатковых ільгот у адносінах да вытворчасці інавацыйных і высокатэхналагічных тавараў. З 2012 года прыбытак ад вытворчасці і рэалізацыі інавацыйных тавараў будзе цалкам вызваляцца ад падаткаабкладання. А ў адносінах да прыбытку ад рэалізацыі высокатэхналагічных тавараў стаўка падатку складае 10 працэнтаў. Пры гэтым калі будзе дасягнута ў агульным аб'ёме рэалізацыі больш як 50 працэнтаў аб'ёму вытворчасці высокатэхналагічных тавараў, то такі прыбытак будзе цалкам вызваляцца ад падатку.

Закон таксама прадугледжвае пакет іншых мер падатковага характару. У першую чаргу гэта адаптацыя падатковых ставак, устаноўленых у беларускіх рублях, да новых цэнавых умоў. Тут прадугледжана павелічэнне на моцны алкаголь і тытунёвыя вырабы. У 2012 годзе яны будуць павялічвацца штоквартальна ў рамках не больш як 20 працэнтаў, адзначыў Дзмітрый Кійко.

### БЕЛАРУСЬ ВЫПУСЦІЛА ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДОЎГАТЭРМІНОВЫЯ АБЛІГАЦЫІ НА BR4,7 ТРЛН

**Дзяржаўныя доўгатэрміновыя аблігацыі на суму Br4,7 трлн з тэрмінам абарачэння адзін год выпушчаны ў Беларусі. Гэта прадугледжана пастановай Саўміна ад 30 снежня 2011 года № 1774, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Сродкі, атрыманыя за кошт размяшчэння дзяржаўных доўгатэрміновых аблігацый, у якасці грашовага ўкладу будуць унесены ў статутныя фонды ААТ «ААБ Беларусбанк» у памеры Br3,9 трлн і ААТ «Белаграпрамбанк» — Br800 млрд.

Пастановай таксама прадугледжана ўнясенне за кошт астаткаў сродкаў рэспубліканскага бюджэту, у тым ліку часова размешчаных у дэпазіты гэтых банкаў, у якасці грашовага ўкладу ў статутныя фонды Беларусбанка Br9 трлн і Белаграпрамбанка Br800 млрд.

# НАВАГОДНІ ЗВАРОТ

## Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі да беларускага народа



*31 снежня 2011 г.*

Дарагія сябры!

Праз некалькі імгненняў нам трэба будзе перагарнуць яшчэ адну старонку нашай гісторыі. Гісторыі дзяржавы і народа, гісторыі кожнага з нас.

Трыста шэсцьдзесят пяць радкоў адыходзячага 2011-га года напісаны нібыта ў адзін міг. Але яны ўвабралі ў сябе ўсю палітру нашых пачуццяў: засмучэнні і натхненні, нягоды і радасці, перажыванні і надзеі.

У мяне як Прэзідэнта краіны ёсць унікальная місія — у гэтыя хвалюючыя святочныя мінуты зазірнуць у вашы дамы і павіншаваць з Новым годам.

Відаць, кожны з вас ужо даў сваю ацэнку мінуламу году: хтосьці назваў яго цяжкім, хтосьці ўдачным...

Сёння ўжо не мае значэння, якім ён быў. Важна, што ён быў. Ён — наша гісторыя: перамог і няўдач, здзяйсненняў і расчараванняў. Яго не выправіць і не перарабіць. А вось урокі з падзей адыходзячага года атрымаць трэба.

Мы не дапусцілі эканамічнага краху, беспрацоўя, згортвання сацыяльных праграм і разладу ў грамадстве.

Мы не прагнуліся пад праблемамі. Не далі ім асядлаць нас.

Насуперак усяму даказалі, што з'яўляемся моцнай і з'яднанай сям'ёй. Адзінай і сапраўды вялікай нацыяй!

Мы можам і павінны гэтым ганарыцца!

Хачу ад усяго сэрца падзякаваць усім вам за разуменне і падтрымку, за стойкасць і аптымізм.

І асабліва за ваш давер!

Дзякуй усім, хто самаадданa працаваў на карысць краіны.

Сялянам — за багаты ўраджай.

Рабочым і інжынерам, будаўнікам і шахцёрам, кіраўнікам прадпрыемстваў — за энергію і прадпрымальнасць.

Настаўнікам, урачам, вучоным, усёй нашай інтэлігенцыі — за натхнёную і высакародную працу.

Людзям у пагонах — за мужнасць і пачуццё абавязку.

Зямны паклон нашым цудоўным жанчынам, чый клопат і дабрата саграваюць наш утульны беларускі ачаг.

Апошнія дні года я пабываў у соцень дзетак, якім патрэбна дапамога дзяржавы. Віншуючы іх ад маёй маленькай сям'і з Новым годам, я спытаў іх аб пажаданнях і абрадаваўся адказу: яны прасілі, каб у маім навагоднім звароце да беларускага народа знайшлося месца ім, будучыні нашай краіны.

Я ім абяцаў і сваё абяцанне выконваю! У гэтыя імгненні адыходзячага года хачу звярнуцца не толькі да дзяцей, але і да ўсёй моладзі Беларусі: любіце сваю зямлю, шануйце яе, аберагайце ад нягод і ўзрушэнняў. Рабіце гэта таму, што іншай зямлі, імя якой Радзіма, у вас ніколі не будзе!

Толькі яна зможа вас сагрэць у лютую сцюжу і даць глыток халоднай вады ў спёку! На ёй жыць вам і вашым дзецям!

Дарагія суайчыннікі!

Чалавечае знаходжанне на планеце Зямля вельмі кароткачасовае.

І ўсё ж у кожнага з нас ёсць магчымасць змяніць гэты свет і сваю Бацькаўшчыну. Трэба толькі зрабіць правільны выбар таго, як мы будзем жыць.

Паставіць перад сабой мэту і цвёрда, упарта, настойліва ісці да яе дасягнення — гэта наш шлях. Гэта лёс моцнага народа і жыццяздольнай дзяржавы.

Зрабіць Беларусь моцнай і паважанай, ператварыць яе ў камфортны і добры дом для ўсіх — такую задачу мы вызначылі для сябе ў якасці найважнейшай.

Перакананы: разам, поплеч мы даб'ёмся гэтай вялікай мэты.

Вы павінны быць упэўнены — дзяржава зробіць усё магчымае для падтрымкі канкрэтнага чалавека і яго сям'і.

Але пры гэтым мы абавязаны добра засвоіць: ніхто і ніщто не прынясе нам спакою і дабрабыту, акрамя нас саміх. Як будзем працаваць — так будзем і жыць.

І яшчэ. Сёння самы каштоўны рэсурс — час. Калі спынімся ў развіцці, запаволім тэмпы або саб'ёмся з рытму — можам адстаць на гады.

Да фінішу прыйдуць самыя стойкія, упартыя і вынослівыя. І беларусы проста абавязаны быць сярод пераможцаў. Мы здольныя на гэта!

У нас з вамі ёсць выдатная рыса — пачуццё локця. Мы заўсёды былі сумленныя, ніколі не здраджвалі блізкаму. Усе праблемы выраішалі разам, дапамагаючы і суперажываючы адзін аднаму. Давайце ж свята шанаваць і берагчы гэту якасць!

Дарагія сябры!

Вось-вось праб'е гадзіннік і мы ўвойдзем у новы год з добрымі думкамі і радаснымі надзеямі.

Кажуць: самыя шчаслівыя людзі — тыя, хто вельмі заняты, каб думаць аб гэтым. Дык давайце не разважаць, а ствараць сваё шчасце.

Няхай клопат пра Беларусь жыве ў сэрцы кожнага з нас!

Няхай справа, якой вы аддаяце сябе, прыносіць вам матэрыяльны дастатак, унутранае задавальненне і добрую славу.

Няхай бескарыслівая любоў, якую вы шчодра дорыце сваім блізкім, спаўна вяртаецца вам.

Давайце зробім усё, каб вочы беларускіх дзяцей іскрыліся ўсмешкамі, радасцю і надзеяй.

Каб дабрабыт назаўжды пасяліўся ў нашы дамы.

Шчасця, здароўя, удачы вам, дарагія сябры!

З Новым годам!

# 2012 — ГОД КНІГІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 30 снежня падпісаў указ № 618 «Аб аб'яўленні 2012 года Годам кнігі».**

Такое рашэнне прынята ў мэтах павышэння ролі кнігі і чытання ў сучасным грамадстве, выхавання ў маладога пакалення любові да мастацкага слова, развіцця айчыннай літаратуры, забеспячэння дзяржаўнай падтрымкі нацыянальнага кнігавыдання.

Кіраўнік дзяржавы даручыў Савету Міністраў зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні гэтага года.

Аб'яўленне ў Беларусі Года кнігі з'яўляецца пераканаўчым сведчаннем таго, што пытанні захавання духоўнасці грамадства, развіцця беларускай літаратуры і культуры — прадмет асаблівага клопату дзяржавы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

## Нашчадкі Францыска Скарыны



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь:**

— Прэзідэнт краіны напрыканцы адыходзячага года падпісаў Указ № 618 «Аб абвяшчэнні 2012 года Годам кнігі», гэта з'яўляецца пераканаўчым сведчаннем таго, што пытанні захавання духоўнасці грамадства, развіцця беларускай літаратуры і культуры — у цэнтры асаблівай увагі дзяржавы. Па сутнасці, гэта клопат пра будучыню нашага народа і краіны.

Мерапрыемствы, якія пройдуць у Год кнігі, дазволяць істотна ўзняць цікавасць да літаратуры. Хоць Беларусь па-ранейшаму застаецца адной з самых чытаючых краін у свеце, і айчынныя выдавецтвы гэтаму актыўна спрыяюць. За год у краіне выдаецца прыкладна 4 кнігі ў разліку на аднаго жыхара — што ўвогуле супастаўна з узроўнем такіх краін, як Францыя і Германія, там гэты паказчык складае 5—5,5. А ва Украіне, для параўнання, на аднаго жыхара выдаецца толькі адна кніга.

На працягу апошніх гадоў Міністэрствам інфармацыі ажыццяўляліся сістэмныя мерапрыемствы па павышэнні зместавага ўзроўню выданняў, паляпшэнню іх мастацка-графічнага выканання. Не будзе перабольшаннем сказаць пра высокі прафесіяналізм калектываў дзяржаўных выдавецтваў: яны выпускаюць кнігі, якія займуць годнае месца ў духоўнай скарбонцы беларускага народа. Як не ўзгадаць зборы твораў класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа, Максіма Танка, Івана Шамякіна, выданне нацыянальных энцыклапедый «Гарады і вёскі Беларусі», «Рэгіёны Беларусі», «Культура Беларусі», «Максім Багдановіч»...

Беларусь шануе і развівае лепшыя традыцыі айчыннай літаратуры і кнігавыдання. Сімвалічна, што першую сваю кнігу наш славуты суайчыннік, першадрукар усходніх славян Францыск Скарына выдаў у 1517 годзе — і сёлета мы адзначым своеасаблівы юбілей, 495-годдзе гэтай знакавай падзеі... Яго кнігі ўспрымаюцца сёння не толькі як нацыянальная рэліквія, але і як духоўны набытак нацыянальнай культуры. Мудрыя словы Францыска Скарыны як ніколі актуальныя: «Любіце кнігу, бо яна — крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы».

**Падрыхтавала Таццяна ПАДАЛЯК.**

*(Працяг тэмы на 3-й стар.)*

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.01.2012 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 8 350,00 | 1 чэшская крона | 425,10 |
| 1 еўра | 10 850,00 | 1 польскі злоты | 2 425,42 |
| 1 латвійскі лат | 15 491,65 | 1 расійскі рубель | 261,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 138,57 | 1 украінская грыўня | 1 042,45 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 32,1961 |
| 10 UAH | 40,0549 |
| 10000 BYR | 38,5582 |
| EUR | 41,6714 |

АГЕНЦТВА УЛАДЗІМІРА ГРАЎЦОВА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Студзеньская вада ў сталіцы.

**Надвор'е**

## МОКРЫ СНЕГ, ДОЖДЖ І ВЕТРАНА

**НА ГЭТЫМ ТЫДНІ тэрыторыя Беларусі зноў апынулася пад уплывам атлантычных цыклонаў і іх атмасферных франтоў, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

На працягу тыдня чакаецца даволі вільготнае і няўстойлівае надвор'е, калі на большай частцы краіны пройдзе мокры снег і дождж. Уначы і раніцай галалёд і галаледзіца на дарогах. У сераду і чацвер у многіх раёнах узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с.

Сёння ўдзень тэмпература паветра 0 — плюс 6 градусаў, а 5 і 6 студзеня на працягу сутак — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, у выхадныя на тэрыторыю Беларусі завітае ўжо крыху больш халоднае паветра з боку краін Скандынавіі. Таму ў суботу і нядзелю ападкі чакаюцца ўжо ў выглядзе мокрага снегу. Тэмпература паветра ўначы ўжо ад 0 да 7 марозу, удзень — ад мінус 5 да плюс 3 градусаў. На дарогах месцамі галаледзіца. Прагназуецца, што і 9 студзеня на працягу сутак будзе ад 0 да мінус 6 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## У Мінску стартаваў 8-ы Калядны турнір на прызы Прэзідэнта

**4 студзеня Мінск прымае ўжо 8-ы па ліку Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі. Сёлета колькасць удзельнікаў засталася нязменнай, затое змяніліся краіны-ўдзельніцы. На гэты раз у спаборніцтвах упершыню возьмуць удзел славенцы, а таксама чэхі і шведы (яны гулялі толькі на першых трох турнірах). Сярод пастаянных удзельнікаў — каманды Канады, Аўстрыі, Фінляндыі, Расіі і каманда Прэзідэнта Беларусі.**

— Мы традыцыйна атрымліваем шмат заявак на ўдзел, але вымушаны абмяжоўваць колькасць камандаў 8-ю, бо тэрміны правядзення абмежаваныя. Сёлета мы адмовілі Германіі, Славакіі, Украіне і Швейцарыі, бо яны выступалі летась, але запросім іх наступны раз, — расказаў **старшыня федэрацыі хакея Яўген ВОРСІН**.

Ужо зараз многія называюць адным з фаварытаў дружыну Чэхіі, дзе, дарэчы, шмат зорных у мінулым хакеістаў. Напрыклад, легенда чэшскага хакея Іржы Бубла, сярэбраны прызёр Алімпіяды-76, які згуляў больш за 250 матчаў за НХЛаўскі «Ванкувер Кэнакс», і Францішак Кучэра, пераможца Алімпіяды-98, які мае таксама багаты вопыт выступленняў у НХЛ. Не менш грозным сапернікам будзе сёлета і адзін з самых тытулаваных удзельнікаў турніру — аматарская зборная Фінляндыі. Яе галоўны козыр — варатар Юка Тамі, які правёў 260 матчаў за нацыянальную каманду Фінляндыі, удзельнічаў у чатырох Алімпіядах і сямі чэмпіянатах свету. Ну а каманду Расіі дадаткова і прадстаўляць не трэба. Дастаткова нагадаць, што ў яе актыве пяць сярэбраных медалёў Каляднага турніру і два залатыя, заваяваныя ў 2007-м і летась. Асноўнай турнірнай задачай дружыны Аляксандра Мядзведзева сёлета, безумоўна, стане абарона чэмпіёнскага тытула. У той жа час беларуская дружына, якая выйграла Калядны турнір пяць разоў, пастараецца вярнуць трафей чэмпіёна.

**Капітан беларускай каманды Андрэй АСТАШЭВІЧ расказаў, як рыхтавалася дружына Прэзідэнта:**

— Наша каманда пачала трэніравацца з пачатку сезона. Многія хакеісты выступаюць у Начной хакейнай лізе, амаль усе гуляюць 1-2 разы на тыдзень. Плюс мы трэніруемся тры разы на тыдзень. За 10 дзён да турніру мы дадаткова сабраліся, адпрацоўвалі ўзаемадзеянні ў звеннях. Сёлета да нас далучыліся былыя гульцы зборнай Беларусі Алег Антоненка, Уладзімір Світа, Аляксандр Макрыцкі. Узроставыя гульцы, але нам яны падыходзяць. Рыхтаваліся сёлета па-асабліваму, і ў нас ёсць шанц выйграць турнір.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## «Кітайскія» манеты ў Беларусі

**Нацыянальны банк увёў у абарачэнне памятныя манеты «Беларусь — Кітай. 20 гадоў дыпламатычных адносін».**

Першая, сярэбраная, мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 33,63 грама і дыяметр 38,61 міліметра. Другая, медна-нікелевая, намінал 1 рубель, масу 13,16 грама і дыяметр 32 міліметры. Манеты адчаканены на АТ «Манетны двор Польшчы» якасцю «пруф» (сярэбраная) і «пруф-лайк» (медна-нікелевая). Тыраж — 1500 і 2000 штук адпаведна.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## Падпал у падарунак?

**«Унясенне крыніцы агню звонку» — такую версію папярэдне выказалі выратавальнікі, якія ліквідавалі пажар у Рагачове.**



Фота МНС.

Будынак, дзе размяшчаўся цэх прыватнага прадпрыемства па вытворчасці профіля і вокнаў з ПВХ, загарэўся раніцай у панядзелак. Практычна поўнасцю згарэлі дах, перакрыцце і маёмасць усярэдзіне пабудовы. Агнём значна пашкоджана 9 станкоў рознага прызначэння, 10 адзінак гатовай прадукцыі і 40 нарыхтовак, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС. Пацярпелых няма — цэх у гэты дзень не працаваў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и стоимость | **Лот № 1** Изолированное помещение с инв. № 200/D-123481 (склад-бытовка), общая площадь – 165,4 кв.м. – стоимость 121 200 000 белорусских рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | ВКМУП «Заря» (г. Витебск, ул. Леонова, 24, УНП 300200317) |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, ул. Володарского, д. 96, пом. 2 |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 17 января 2012 в 11.00 |
| Справочная информация | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324 http://vitebsk.court.by Судебный исполнитель Халков Дмитрий Вячеславович, тел./факс.: 80212491342, 80291502410. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел.: 80212491340 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 16.01.2012. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

### ПЕРАЛІЧАНЫ ДРУГІ ТРАНШ КРЭДЫТУ З АНТЫКРЫЗІСНАГА ФОНДУ ЕЎРАЗЭС

**Другі транш фінансавага крэдыту з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС у памеры $440 млн пералічаны Беларусі. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Еўразійскім банку развіцця.**

У Міністэрстве фінансаў Беларусі карэспандэнту БЕЛТА паведамілі, што крэдыт залічаны на рахунак Міністэрства фінансаў у Нацыянальным банку і будзе накіраваны на папаўненне міжнародных рэзервовых актываў.

Пагадненне паміж Беларуссю і Еўразійскім банкам развіцця аб прадастаўленні фінансавага крэдыту са сродкаў Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС было падпісана 9 чэрвеня 2011 года. Агульны аб'ём крэдыту складае $3 млрд. Сродкі павінны паступіць шасцю траншамі на працягу 2011—2013 гадоў. Першы транш крэдыту ў памеры $800 млн паступіў у Беларусь у чэрвені. Агульная сума крэдыту ў 2011 годзе запланавана ў памеры $1,24 млрд.

### БЕЛАРУСЬ З 1 СТУДЗЕНЯ ЗНІЖАЕ ЭКСПАРТНЫЯ ПОШЛІНЫ НА НАФТУ І НАФТАПРАДУКТЫ

**Беларусь з 1 студзеня 2012 года зніжае экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 1756 ад 28 снежня 2011 года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

З 1 студзеня экспартная пошліна на нафту знізіцца на 2,2 працэнта — з $406,6 да $397,5 за 1 т. Адзіная стаўка экспартнай пошліны на светлыя і цёмныя нафтапрадукты (акрамя бензіну), якая з 1 кастрычніка ўніфікавана на ўзроўні 66 працэнтаў ад пошліны на нафту, з 1 студзеня складзе $262,3 за 1 т супраць $268,3 у снежні. Такая ж пошліна ўстаноўлена на бензол, талуол, ксілолы. На бензіны таварныя і прамагонны бензін стаўкі вывазных мытных пошлін, зыходзячы з каэфіцыента 0,9, складуць $357,7 за 1 т замест $365,9 у снежні. Пошліна на прапан, бутаны, этылен, прапілен, бутылен і бутадыен, іншыя звадкаваныя газы ўстаноўлена на ўзроўні $201 замест $221,8.

ISSN 1990 - 763X

### ШПІЁНСКІЯ ШТУЧКІ...

**Праз інтэрнэт 37-гадовы дырэктар аднаго з прыватных прадпрыемстваў Гомеля набыў электронныя прылады, якія маюць функцыі фота-, відэа- і аўдыязапісу. Прыстасаванні былі ўбудаваны ў аўтаручкі.**

У сваёй краме прадпрымальнік прапаноўваў шпіёнскія пісьмовыя прылады па 500 тысяч рублёў за штуку. Паставіць на паток незаконны збыт спецыфічнай тэхнікі перашкодзілі супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці. Заведзена крымінальная справа

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# НОГІ ЎГОРУ!

**Прамая лінія газеты «Звязда» і радыёстанцыі «Мір»**

**СУМЕСНА з радыёстанцыяй «Мір» наша газета правяла «прамую лінію» па тэме прафілактыкі і лячэння варыкознага расшырэння вен. Чаму нават у маладых жанчын на нагах з'яўляюцца «зорачкі» і «павуцінкі»? Што ёсць проста касметычны дэфект, а што — захворванне, якое трэба лячыць? На пытанні карэспандэнтаў, а таксама слухачоў і чытачоў адказаў дацэнт кафедры хірургіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Ігнат ДАВІДОЎСКІ.**



**«Мір»: Што спрыяе развіццю такога захворвання, як варыкознае расшырэнне вен?**

— У першую чаргу размова ідзе пра хранічнае захворванне, якое няўхільна прагрэсуе. Падругое, ёсць канкрэтныя прычыны, якія спрыяюць яго развіццю — недастатковая колькасць эластычных валокнаў у сценцы вены і неадэкватная работа вянозных клапанаў. Акрамя таго, у 80-90 працэнтах выпадкаў хвароба абумоўлена спадчыннасцю. Тым не менш, нават калі ў некага з вашых бацькоў ёсць такое захворванне, гэта азначае толькі, што вы — у групе рызыкі. А далей вельмі многае залежыць ад ладу жыцця. Так, існуе цэлы шэраг устаноўленых фактараў, якія спрыяюць захворванню вен. Гэта працяглае знаходжанне ў становішчы стоячы або седзячы, недахоп фізічнай нагрузкі, уздзеянне высокіх тэмператур, лішняя вага, цяжарнасць і роды, наогул гарманальная перабудова арганізма.

Асобна, відаць, трэба сказаць пра фактар цяжарнасці, калі адбываецца не толькі ўласна гарманальная перабудова, але і агульнае павелічэнне колькасці крыві ў арганізме, рост маткі, якая сціскае вены малога таза, запавольванне нармальнага току крыві. Што тычыцца наогул гарманальнага фактару, то трэба сказаць і пра тое, што вялікая група маладых жанчын, якія яшчэ не нараджалі, ужо маюць першыя прыкметы захворвання — «павучкі» і «зорачкі». Гэтаму спрыяе ўжыванне гарманальнай кантрацэпцыі, якая расслабляе вянозную сценку.

Варыкознае расшырэнне вен можна назваць і прафесійным захворваннем, паколькі яму спрыяе любая работа, якую даводзіцца выконваць у становішчы стоячы або седзячы. Маецца на ўвазе, працяглае стаянне або сядзенне. Адсутнасць хоць бы нязначнага руху правакуе застой крыві.

**«Мір»: Кроў па венах, як вядома, рухаецца знізу ўгору. Няпросты працэс... А тут яшчэ мы штучна яму перашкаджаем...**

— Для нармальнай работы вен неабходна, каб мышцы пастаянна скарачаліся і сціскалі іх. Што да рабочага працэсу, то ў любым выпадку можна рабіць кароткія перапынкі для таго, каб пахадзіць і размяцца. Калі і гэта немагчыма, дастаткова хоць бы седзячы размяць галёнку — перакочваць нагу з пяткі на насок, прымусова скараціць ікраножныя мышцы. Ідэальны варыянт — прылегчы на кушэтку і ўзняць ногі ўгору. Безумоўна, не на карысць нармальнай рабоце нашых вен — працяглыя паездкі ў аўтатранспарце або пералёты ў самалёце. Але мы не можам не ездзіць і не лятаць. Дастаткова не забывацца на размінку ікраножных мышцаў. Дапаможа і лёгкі масаж ног рукамі. Наогул жа нам патрэбна аптымальная фізічная нагрузка — не прафесійны спорт, а плаванне, лыжы, веласіпед, хада, бег без вялікай нагрузкі.

**«Мір»: Вы сказалі пра ўздзеянне гарачых тэмператур... Значыць, лазня або саўна для вен некарысныя?**

— Некарысныя. Як і работа ў гарачым цэху або пражыванне ў гарачым клімаце. Цеплавое ўздзеянне спрыяе прытоку крыві, павышае ціск, у тым ліку і вянозны, а значыць, сценка вены пакрысе пачынае пашырацца. Нельга сказаць, што ад лазні ці саўны трэба цалкам адмовіцца, але трэба памятаць, што любоў менавіта да парылкі, масаж венікам ног — непажаданыя.

**«Мір»: Шкодныя звычкі аказваюць якое-небудзь шкоднае ўздзеянне менавіта на вены?**

— Курэнне і алкаголь аказваюць шкоднае ўздзеянне, хутчэй, на здароўе ўсяго арганізма, а значыць, і на вены... Хоць у большай ступені ад шкодных звычак пакутуюць артэрыі...

**«Мір»: Якія прыкметы сведчаць аб наступленні хваробы?**

— На нагах можна ўбачыць пэўныя сасудзістыя змяненні — «зорачкі» і «павуцінкі», як іх называюць нашы пацыенты. Хоць трэба мець на ўвазе, што, часцей за ўсё, апошнія з'яўляюцца праявай нейкага гарманальнага парушэння. Для вянознай праблемы больш характэрныя не столькі знешнія прыкметы, колькі адчуванне пэўнага дыскамфорту ў канечнасцях — цяжару, лёгкай ацёчнасці, асабліва напрыканцы рабочага дня. Ніякіх іншых праяў на самым пачатку можа і не быць. Часам нашы пацыенты ўказваюць на сутаргі, якія бываюць у начны час, аднак на наяўнасць гэтага сімптому ўплывае і недахоп кальцыю... Бывае і так, што буйныя вены ног ужо значна расшыраныя, а болевага сіндрому, пачуцця стомленасці ў нагах няма. Таму боль — не асноўная прыкмета захворвання.

**«Мір»: Як вы ставіцеся да самастойнага набыцця мазяў для аблягчэння стану, пра якія вы сказалі?**

— Паколькі, як бачыце, не існуе адной канкрэтнай прычыны, па якой можна было б паставіць дыягназ варыкознага расшырэння вен, неабходны візіт да спецыяліста. Перад тым, як ісці траціць грошы, варта звярнуцца да ўрача-хірурга або сасудзістага хірурга. Так і грошы не выкінем на вецер, і не патрацім дарэмна час на безвыніковае самалячэнне.

**«Мір»: Наколькі я разумею, вярнуць вену ў ранейшы стан немагчыма, але, тым не менш лячэнне існуе...**

— Безумоўна. І пачынаць лячыцца трэба як мага раней. Гэта істотна запаволіць прагрэс захворвання. Так, на першых этапах рэкамендуецца нашэнне кампрэсійнага трыкатажу, які штучна сціскае пашыраныя вены. Плюс — прызначэнне медыкаментаў з групы венатонікаў, якія павышаюць тонус сасудаў. І на пачатковых і на больш позніх этапах для дробных хворых вен прымяняецца склератэрапія — працэдура ўвядзення прэпарата, які склейвае вену, і па ёй кроў ужо не рухаецца. Дзякуй Богу, вен у нас шмат. Так што гэта істотна не паўплывае на якасць нашага жыцця.

**«Мір»: Што будзе, калі не лячыцца?**

— Узнікнуць ускладненні, пачынаючы з вянозных экзэм, дэрматытаў — запалення скуры, ушчыльнення і запалення падскуранай клятчаткі, з'яўлення вялікіх карычневых плям у ніжняй частцы галёнкі... На фоне гэтых трафічных расстройстваў можа развіцца і трафічная язва. Яна лечыцца толькі хірургічна, працягла і каштуе гэта дорага... Акрамя таго, можа быць і запаленне вен, або трамбоз, асабліва калі гэта будзе трамбоз не падскурных, а глыбокіх вен, дзе тромб можа пад уздзеяннем пэўных фактараў раптоўна адарвацца і перакрыць сасуды лёгкага, што ў сваю чаргу прывядзе да тромбаэмбаліі лёгачнай артэрыі. Такі стан пагражае гібеллю.

**«Звязда»: Ці могуць быць артэрыі здаровымі, а вены хворымі?**

— Могуць хварэць толькі вены ці толькі артэрыі. У старэчым узросце наогул будуць пакутаваць усе сасуды, аднак, па вялікім рахунку, размова ідзе пра абсалютна розныя хваробы. Самае распаўсюджанае захворванне вен — варыкознае расшырэнне.

**«Звязда»: Да якога спецыяліста варта звяртацца пры першых падазрэннях?**

— Да ўрача-хірурга па месцы жыхарства, які далей накіруе да вузкага спецыяліста, які ў свеце называецца флеболагам, а ў нас — сасудзістым хірургам. Дарэчы, трэба сказаць, што нашы спецыялісты на месцах, асабліва ў рэгіёнах, часам не надаюць гэтай праблеме належнай увагі. І пацыент, і доктар часцей засяроджваюць сваю ўвагу на адчуванні болю. Калі боль нямоцны, то праблемай усур'ёз і не займаюцца... А ўжо ў крайніх выпадках накіроўваюць адразу на аперацыю. Адпаведныя апаратыўныя ўмяшанні сёння выконваюць ва ўсіх абласцях і нават раёнах.

**«Звязда»: А як менавіта ажыццяўляецца дыягностыка?**

— Па-першае, непасрэдна па знешнім выглядзе. Далей спецыяліст павінен разабрацца, што з'яўляецца прычынай варыкозу. Гэта пярвічная варыкозная хвароба або іншая паталогія, якая таксама праяўляецца расшыранымі венамі? І адзін, і другі стан праяўляюцца аднолькава — пашыранымі венамі, аднак прычыны развіцця гэтых хвароб розныя. Варыкоз — гэта закупорка глыбокіх вен, у выніку чаго парушаецца адток крыві, якая шукае шляхі з дапамогай пашырэння вен. Але можа быць і прыроджаная паталогія злучэння вен і артэрый, калі, зноў жа, знешнія праявы будуць тыя ж самыя, але падыход да лячэння — зусім іншы...

Выкананне ўльтрагукавой дыягностыкі дазваляе нам убачыць не толькі павярхоўныя вены, якія мы і так бачым, але і стан глыбокіх вен. Ультрагук дапамагае ацаніць і работу вянозных клапанаў. Гэтае даследаванне нельга назваць стапрацэнтным пры пастаноўцы дыягназу, і, тым не менш, метад сучасны і неінвазіўны. Без правядзення ўльтрагуку ніхто не возьмецца і за аперацыю. Справа ў тым, што для правядзення апаратыўнага ўмяшання неабходна вызначыцца з аб'ёмам гэтага ўмяшання. Проста выдаліць расшыраныя вены — не вырашэнне праблемы. Не пройдзе і года, як гэты пацыент зноў апынецца на стале ў хірурга. Наша задача — пераканацца, што клапаны не працуюць, і механічна зрабіць так, каб кампенсаваць гэты стан. Гэта можа быць як падцісканне вены, так і перасадка вянознага ўчастка з рукі... Пасля аперацыі мы замацоўваем эфект рэкамендацыяй абавязкова выкарыстоўваць эластычны трыкатаж. Ён зараз вельмі прыгожы, рознай ступені сціскання і ад розных вытворцаў...

Што да іншых метадаў даследавання, то ў складаных выпадках, пры другасных станах прымяняюцца і магнітна-рэзанансная, і камп'ютарная тамаграфія. Ёсць і флебаграфія — увядзенне ў вену кантраснага рэчыва і выкананне здымка, на якім таксама бачныя змены ў венах. Галоўнае — умець прачытаць гэты здымак, паколькі артэрый на назе мала, а вен — вельмі многа...

**— Мінскі раён, Аліна Аляксандраўна. У маёй маці ёсць праблема, якой прысвечана ваша «прамая лінія»... «Павуцінка» ёсць і ў мяне. Што наогул павінен рабіць пацыент з першымі прыкметамі варыкозу або проста для прафілактыкі?**

— Лячыцца трэба пачынаць, калі з'яўляецца сімптаматыка вянознай недастатковасці. Скажам, адчуванне цяжару ў нагах. На ўльтрагуку, дарэчы, у такім выпадку ўсё можа быць нармальна, але ж праявы ёсць, і мы павінны нечым дапамагчы. У першую чаргу, трэба рэкамендаваць часцей рабіць перапынкі ў сядзячай рабоце — хадзіць, размінацца, узнімаць ногі ўгору. Трэба рэгулярна рабіць зарадку, прымаць кантрасны душ. Падчас сну можна падкладваць пад ногі падушку, прычым падкладваць трэба менавіта пад ікраножную мышцу. Ідэальна было б заняцца плаваннем. Зімой дарэчы будуць лыжы, летам — веласіпед. Плюс — нашэнне трыкатажу, які прадаецца ў спецыялізаваных артапедычных цэнтрах, некаторых аптэках і магазінах медтэхнікі. Трыкатаж выпрабляюць Італія, Швейцарыя, Германія, ЗША, Літва. Панчохі, калготы бываюць розных класаў — па ступені сціскання. Яны адрозніваюцца і якасцю, і прыгажосцю, і, вядома, коштам. Насіць жа такія калготкі можна не больш як паўгода. Летам, вядома, мы дазваляем пацыентам адмовіцца ад калготак, хоць цяпер вытворцы спрабуюць выпускаць і вельмі-вельмі тонкія... На той час, пакуль адмяняецца трыкатаж, прапісваюцца флебатонікі — лекі, якія дапамагаюць сценкам вен лепш скарачацца, танізуюць вену і паляпшаюць мікрацыркуляцыю ў дробных капілярах. Гэта прэпараты на раслінны аснове — конскага каштану (эскузан) і апельсінавага дрэва (дэтралекс і флебадыя-600). Прымаецца па 1 таблетцы 2 разы на дзень, па два месяцы двойчы за год.

Што да мазяў, то ў іх састаў уваходзяць, як правіла, тыя прэпараты, якія ўваходзяць і ў таблеткі. Але прыём таблетаваных лекаў куды больш эфектыўны. Як правіла, мазь проста крыху аслабляе непрыемныя сімптомы цяжару ў нагах, здымае ацёчнасць. Праз два месяцы выкарыстання такіх мазяў самаадчуванне палепшыцца, але не трэба разлічваць, што надоўга. І трэба мець на ўвазе, што эфект будзе дасягнуты на самых пачатковых стадыях захворвання.

**— А калі ўжо з'явіцца вузялок?**

— Калі з'явіцца вузялок, «зорачак» будзе шмат, значыць, можна рэкамендаваць склератэрапію. Гэта, дарэчы, вельмі стары метад. На сёння для выканання працэдуры мы прымяняем, галоўным чынам, прэпарат нямецкай вытворчасці. Ён дае значна менш ускладненняў, чым было раней, калі пасля выканання працэдуры ўзнікалі і пігментныя плямы, і нават язва, калі рэчыва трапляла непасрэдна пад скуру.

Склератэрапію выконвае толькі ўрач, ні ў якім разе не медсястра, бо наша задача — не проста трапіць у вену, а не выклікаць там штучны тромбафлебіт... Працэдура не ажыццяўляецца ў бальніцах, а толькі ў камерцыйных медцэнтрах, дзе ёсць сасудзістыя хірургі. Прымяняецца склератэрапія і пасля хірургічнага ўмяшання, паколькі кожную пашыраную вену не прааперыруеш. Вакол выдаленай вены, вакол язвы, якая ўтварылася ў выніку захворвання, можна правесці склеразаванне, каб прыпыніць прыток крыві ў гэтым участку. Язва тады лепш загойваецца.

**— А лазерам у нас не лечаць?**

— Для нескладаных сітуацый, сапраўды, прымяняецца і лазер. Яго выкарыстоўваюць, напрыклад, для ўнутранага ўмяшання — «выпальваюць» вену, ператвараюць яе ў рубец, і кроў там ужо не бяжыць. Ёсць і вонкавае ўздзеянне лазеру на дробныя, павярхоўныя вены.

**— Што будзе, калі не лячыцца?**

— Можа развіцца тромбафлебіт, трамбоз глыбокіх вен, калі тромб імгненна перакрывае лёгачную артэрыю. Калі перакрые дробную артэрыю, гэта можа праявіцца і як запаленне лёгкіх. А ўвогуле размова ідзе пра стан, небяспечны для жыцця.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
***(Працяг будзе.)***

# УЦЯПЛЯЦЦА ЗА СВОЙ КОШТ?

**У сталічнай ЖКГ лічаць, што ў перспектыве жыльцы павінны ўдзельнічаць у фінансаванні работ па цеплавой мадэрнізацыі жылых дамоў.**

У ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» (МГЖГ) мяркуюць, што ў перспектыве жыльцоў трэба прыцягваць да фінансавання работ па цеплавой мадэрнізацыі жылых дамоў.

— У сталіцы налічваецца 5 356 жылых дамоў, пабудаваных да 1997 года, гэта значыць, з нізкім каэфіцыентам цеплаcупраціўлення, — паведаміў начальнік тэхнічнага аддзела МГЖГ Сяргей Драпей. — Іх неабходна мадэрнізаваць. Дзяржава такую фінансавую ношу не пацягне. Рана ці позна давядзецца ўкладваць уласныя сродкі ў гэтыя мерапрыемствы і ўладальнікам кватэр.

На думку спецыяліста, зацікаўленасць у гэтым будзе расці па меры павелічэння кошту цеплаэнергіі — сёння дзяржава пакрывае больш за 80% расходаў на ацяпленне жыллёвага фонду, але пастпова гэтая доля будзе зніжацца. А грошы жыльцоў, укладзеныя ў цеплавую мадэрнізацыю дома, у далейшым акупяцца за кошт змяншэння платы за ацяпленне.

Сяргей Драпей прывёў прыклад з замежнага досведу: сёння ў Польшчы не засталося няўцепленых дамоў-«хрушчовак» і панэльных дзевяціпавярховых будынкаў. Работы па іх мадэрнізацыі былі выкананы за кошт саміх жыхароў, таму што яны цалкам аплачваюць затрачаную на абагрэў жылога дома цеплаэнергію.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,**
*«Мінск—Навіны».*

**Добрая навіна**

## Вёска жыве школай

**У вёсцы Уланава Шклоўскага раёна адкрылася новая школа. Нягледзячы на канікулы, тут з нагоды ўрачыстага адкрыцця прагучаў пад Новы год школьны званок.**

У вучэбна-педагагічным комплексе працуюць 16 педагогаў. Праз тыдзень за новыя парты сядзе 31 вучань, а 6 малых пойдуць у дзіцячы садок. Новую школу мясцовыя жыхары і кіраўніцтва Шклоўскага раёна разглядае як сімвал таго, што вёска Уланава жыве і развіваецца.

## Кіраўская святочная міля

**У Кіраўску з 2011 годам развіталіся арыгінальным чынам: тут адбыўся лёгкаатлетычны прабег «Навагодняя міля».**

У традыцыйным мерапрыемстве на ўдзел заяўляліся і прафесійныя спартсмены, і проста аматары здаровага ладу жыцця — мужчыны і жанчыны ад 14 да 55 гадоў, у 7 узроставых групах. Звычайная дыстанцыя — 2011 метраў. Гэта больш за звычайную мілю (1609,344 м), але тут міля, хутчэй, сімвалічная. Самым малодшым і самым старэйшым кіраўскім бегунам прапанавалі пераадолець 1011 метраў. Пераможцы і прызёры атрымалі дыпломы і падарункі.

## Ферма для фарэлі

**У вёсцы Касічы Быхаўскага раёна распачалося будаўніцтва фарэлевай гаспадаркі. Яе запуск намечаны на 2013 год, і цяпер падрыхтоўчыя справы пачалі спецыялісты ААТ «Магілёўводбуд». Агульны кошт праекта ацэньваецца ў 32 мільярды рублёў.**

Фарэлевая ферма не проста дасць новыя працоўныя месцы жыхарам раёна, але і паслужыць справе імпартазамяшчэння. Спецыялісты ў рыбнай справе запэўніваюць, што з дапамогай такіх праектаў, як быхаўскі, мы будзем есці не перамарожаную імпартную фарэль па цане 10 еўра за кілаграм, а ўласную — свежую і значна таннейшую. Паводле планаў кіраўніцтва Магілёўскай вобласці, да 2015 года ў рэгіёне будзе выраблядца 500 тон рыбы каштоўных парод штогод.

**Ілона ІВАНОВА.**


## Информация о проведении аукциона с условием по продаже недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **ЛОТ №1** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | – незавершенное законсервированное здание цеха товаров народного потребления (процент готовности – 94) общей площадью 1 615,2 м², с инвентарным номером 630/U-65916 (место расположения: Минская область, Молодечненский район, Мясотский сельский исполнительный совет, поселок Сосновый Бор) с начальной стоимостью 475 800 000 рублей без учета НДС 20% |
| **ЛОТ №2** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | – здание свинарника общей площадью 750,7 м², с инвентарным номером 630/С-42387 (место расположения: Минская область, Молодечненский район, Мясотский сельский исполнительный совет, возле деревни Лазавец) с начальной стоимостью 250 000 000 рублей без учета НДС 20% |
| **ЛОТ №3** | |
| **Адрес объекта и его наименование** | – здание цеха выделки общей площадью 913,6 м², с инвентарным номером 630/С-42189 (место расположения: Минская область, Молодечненский район, Мясотский сельский исполнительный совет, поселок Сосновый Бор) с начальной стоимостью 699 272 941 рубль без учета НДС 20% |
| **Порядок оплаты** | Оплата за вышеназванные объекты в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 20 календарных дней на расчетный счет Продавца с момента заключения договора купли-продажи. Договор купли-продажи будет заключен с Победителем торгов по лоту №2 в течение 10 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, с Победителем торгов по лоту №1 и №3 в течение 10 календарных дней с момента установления границ земельного участка |
| **Сумма задатка** | 10% от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, МФО 153001739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Продавец** | Торговое частное унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза» |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-Сервис» г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1 |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность |
| **Информация по земельному участку** | Объекты (лоты №1 и №3) находятся на земельном участке площадью 3,0174 га с кадастровым номером 623882711101000019. Однако точные границы земельного участка под каждый Объект будут определены путем дополнительного согласования между Победителем торгов и Продавцом объекта и зарегистрированы в установленном законодательством Республики Беларусь порядке, за счет средств Продавца, в срок не позднее 60 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объект (лот №2) находится на земельном участке площадью 0,4580 га с кадастровым номером 623882700098000028 |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | 06.02.2012 до 16⁰⁰, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20; 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | 10.02.2012 в 15⁰⁰, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Условия проведения аукциона** | Продавец имеет право отказаться от аукциона за день до его проведения. Объект (лот №2) обременен договором аренды; срок действия договора аренды по 29.02.2012. |


**Калейдаскоп**

## У АМЕРЫКАНСКІМ АРКАНЗАСЕ Ў НАВАГОДНЮЮ НОЧ — ЗНОЎ МАСАВАЯ ГІБЕЛЬ ДРАЗДОЎ

*А ў Мінску каля Шабаноў на зімоўку застаўся белы бусел*

**У першы дзень новага года каля 200 мёртвых чорных драздоў былі зафіксаваны ў наваколлях горада Біб штата Арканзас (ЗША). Спецыялісты ўпэўнены, што прычынай гібелі птушак сталі святочныя феерверкі.**

Падобны выпадак назіраўся і год таму, калі на зямлю з неба звалілiся каля 4 тысяч драздоў і іншых крылатых. Арнітолагі адзначаюць, што летась масавая гібель птушак ад навагодніх феерверкаў адзначалася ў Турцыі, на поўначы Італіі, у Швецыі і Канадзе. Эксперты адзначаюць, што навагоднія феерверкі моцна палохаюць птушак і прымушаюць іх пакідаць месцы начлегу. А вось чорныя дразды не здольны арыентавацца ў цемры, таму ўразаюцца ў будынкі ці дрэвы і гінуць.

**Спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН** адзначыў, што кожны выпадак масавай гібелі птушак трэба разглядаць асобна і вывучаць скрупулёзна, бо менавіта крылатыя лічацца індыкатарамі стану навакольнага асяроддзя. Спецыяліст паведаміў рэдакцыі, што на тэрыторыі Беларусі летась і ў першыя дні гэтага года масавай гібелі птушак не было. Руслан Шайкін узгадвае, што рэгулярна ў перыяд міграцыі вясной і восенню гінуць птушкі каля аўтамабільных трас у тых месцах, дзе зроблены празрыстыя гукаізаляцыйныя шчыты. Птушкі пералятаюць цераз дарогу даволі хутка, і таму ўдараюцца ў празрыстую перашкоду. Каб пазбегнуць такіх выпадкаў, спецыялісты АПБ рэкамендуюць маляваць на шчытах цёмныя сілуэты небяспечных драпежных птушак.

Сёлета вельмі цёплая восень і зіма пачынае ўплываць на паводзіны асобных пералётных птушак нашай краіны. Так, на зімоўку пад Мінскам застаўся дарослы белы бусел. Магчыма, што летам у яго было пашкоджана крыло, але гэта не факт. Ён і сёння, як адзіны гаспадар, працягвае гуляць па лесапаркавай зоне ў Шабанах, а калі гэта трэба, то ўздымаецца нават на крыло. Птушка выглядае цалкам здаровай. Галоўнае, каб яе не чапалі людзі. Руслан Шайкін упэўнены, што амаль усе выпадкі масавай гібелі птушак звязаны з дзейнасцю чалавека.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ІДЭАЛЬНАГА МУЖЧЫНЫ НЕ ІСНУЕ

**Брытанская кампанія Remington правяла даследаванне і прыйшла да жахлівых для жанчын усяго свету высноў: аказваецца, ідэальных мужчын не існуе. Як паказалі вынікі апытанняў, прынцы і рыцары бываюць толькі ў казках, паведамляюць інфармагенцтвы.**

У даследаванні ўзялі ўдзел 2 тысячы жанчын. Сацыёлагі высветлілі: 75% апытаных дам не вераць у існаванне ідэальнага мужчыны. Зыходзячы з заяў жанчын, спецыялісты склалі пералік таго, што больш за ўсё раздражняе іх у прадстаўніках моцнай паловы чалавецтва.

Адным з галоўных заган мужчын, на думку жанчын, з'яўляецца няздольнасць наладзіць кантакт з сям'ёй і блізкім атачэннем жанчыны. Таксама слабы пол раздражняе выкарыстанне зубной шчоткі партнёркі або бруд у прыбіральні, невыкананне правілаў этыкету, раскідванне бруднай бялізны па падлозе, шчацінне і адрыжка. Далей ідуць камп'ютарная залежнасць і нізкія заробкі. 40% апытаных дам лічаць, што іх мужчыны маглі б зарабляць значна больш грошай.

**БЕЛТА.**


## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 13 января 2012 г. ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Лошанский с/с, аг. Лошаны, участок № 18 | 623684005601000214 | 0,1452 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 894 471 | 37 000 000 | 3 700 000 |
| 2 | Лошанский с/с, д. Прудище, участок № 1 | 623684007601000065 | 0,2097 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 133 880 | 41 000 000 | 4 100 000 |
| 3 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 4 | 623684200601000033 | 0,1445 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 56 000 000 | 5 600 000 |
| 4 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 13 | 623684200601000038 | 0,1536 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 59 000 000 | 5 900 000 |
| 5 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 21 | 623684200601000061 | 0,1330 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 52 000 000 | 5 200 000 |
| 6 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 1 | 623684202601000261 | 0,1404 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 7 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 4 | 623684202601000258 | 0,1392 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 8 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 5 | 623684202601000259 | 0,1388 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 59 000 000 | 5 900 000 |
| 9 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 6 | 623684202601000260 | 0,1384 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 59 000 000 | 5 900 000 |
| 10 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 7 | 623684202601000265 | 0,1380 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 59 000 000 | 5 900 000 |
| 11 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 8 | 623684202601000262 | 0,1376 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 59 000 000 | 5 900 000 |
| 12 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 9 | 623684202601000263 | 0,1372 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 59 000 000 | 5 900 000 |
| 13 | Михановичский с/с, д. Плебанцы | 623684205601000121 | 0,2414 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 000 000 | 85 000 000 | 8 500 000 |
| 14 | Михановичский с/с, д. Серафимово | 623684206101000314 | 0,1224 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 66 000 000 | 6 600 000 |
| 15 | Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, участок № 1 | 623684206601000255 | 0,1566 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 87 000 000 | 8 700 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **13.01.2012 г. в 9.30.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **09.01.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лоты 3–15 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка. Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка. Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, выдает ему выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.

Вяртаючыся да надрукаванага

# «ДАДЗЕНА ДАРУЧЭННЕ: АБЯЦАЛІ — ЗНАЧЫЦЬ, ВЫКАНАЙЦЕ!»

**ТАКОЕ не вельмі часта, але здараецца: калі адказныя асобы публічна — са старонак газеты — паабяцалі вырашыць нейкую праблему канкрэтных заяўнікаў, з якой тыя звярталіся ў рэдакцыю, а потым... забыліся пра яе. Няхай таму нават знойдуцца прычыны, аднак чалавек, прачытаўшы афіцыйны адказ, не можа ўцяміць, што ж адбываецца, бо яго ніхто больш ні пра што не праінфармаваў. Прыкладна так адбылося са скаргай жыхара вёскі Даўгалессе Гомельскага раёна Андрэя Ігнатавіча Мохарава, якая пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» была змешчана ў «Звяздзе» яшчэ 12 лістапада. Матэрыял называўся «Ваду ў Карбачоўцы дадуць цягам тыдня, у Даўгалессі — месяца...»**

Коратка нагадаем, што Андрэй Ігнатавіч наракаў на калонку на вуліцы насупраць свайго дома. Казаў, што летам яшчэ можна ёй карыстацца, а зімой вады няма: калонка прамярзае. І такая сітуацыя — а наш заяўнік, як перасяленец з чарнобыльскай зоны, пражыў на новым месцы больш за дзесяць гадоў — паўтараецца, паводле яго слоў, з года ў год. Здаецца, водаправод і рамантуюць, але канчаткова зняць праблему жыллёва-камунальнае прадпрыемства, на балансе якога ён знаходзіцца, не можа. «А наперадзе ж — зіма», — гаварыў тады напрыканцы Андрэй Ігнатавіч...

Пра згаданую праблему добра ведалі ў Даўгалескім сельскім Савеце. Але ж самі, натуральна, адрамантаваць калонку не маглі. Падавалі заяўкі ў жыллёва-камунальную гаспадарку, там абяцалі выправіць сітуацыю да канца года. Праблему ўскладняла тое, што водаправод у вёсцы даўні, калонкі — яшчэ старых узораў. Для іх зараз не знайсці запчастак, яны літаральна прагнілі.

Тое ж нам у мінулы раз пацвердзілі і ў вышэйназванай жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Выйсцем было б цалкам замяніць калонку на вуліцы Цэнтральнай. З гэтай мэтай планавалася ўзяць патрэбнае ў адной з адселеных вёсак і перанесці ў Даўгалессе. На ўсё пра ўсё — прагучала абяцанне — патрэбна было месяц часу.

І вось праз паўтара месяца зноў тэлефануе Андрэй Ігнатавіч і кажа, што нічога не зроблена... Увогуле. Як так, пасля абяцання? Зноў тэлефануем старшыні Даўгалескага сельскага Савета Марыі Пугачовай і просім даць тлумачэнні. Цягам некалькіх дзён па нашай просьбе яна займаецца высвятленнем усіх акалічнасцяў. Потым паведамляе наступнае.

— На планёрцы ў райвыканкаме з удзелам старшыні я ўзняла гэтае пытанне, сказала, што людзям было публічна абяцана дапамагчы ў вырашэнні іх праблемы цягам месяца, а прайшло ўжо паўтара і нічога не зроблена. Старшыня райвыканкама даў даручэнне прадстаўнікам жыллёва-камунальнага прадпрыемства: абяцалі — значыць, выканайце! Думаю, цягам прыкладна тыдня калонка ў Даўгалессі па вуліцы Цэнтральнай будзе адрамантавана, — сказала Марыя Міхайлаўна.

Дык адрамантавана ці заменена, як было абяцана раней? Было ж сказана, што адрамантаваць яе немагчыма, выйсце — толькі ў замене на аналагічную. Ці знайшлі такую ўвогуле?

Як патлумачыла далей старшыня сельсавета, пакуль гаворка ідзе сапраўды пра рамонт калонкі. Дарэчы, на момант нашай гутаркі тэхніка на месцы ўжо працавала. Сітуацыю ўскладніў прарыў водаправода ў тым жа Даўгалессі, але на вуліцы Чкалава — і там яна была патрэбнай таксама. Як толькі гэтыя работы будуць праведзены, вызваліцца тэхніка, жыллёва-камунальнае прадпрыемства зоймецца ўстаноўкай новай-старой калонкі па вуліцы Цэнтральнай. Яе ўжо знайшлі — за шэсць кіламетраў, у суседняй вёсцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# І ХОЦЬ НАДВОР'Е НЕ ТОЕ, ПАЛЯВАННЕ — ПА «РАСКЛАДЗЕ»

**З пачатку студзеня, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне распачынаюцца некалькі сезонаў палявання. Так, па 31 студзеня — на высакароднага аленя, еўрапейскую лань і на плямістага аленя.**

Здабываць у светлы час сутак дазваляецца дарослых самцоў, селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту. Спосаб палявання — зброевы з засады з вышак, нагадалі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі. З 1 студзеня па 30 красавіка будзе доўжыцца зімовы сезон палявання на дзіка. Зброевым спосабам з засады з вышак на працягу сутак можна будзе здабываць дарослых самцоў, маладняк да двух гадоў любога полу.

Па 31 студзеня будзе працягвацца паляванне на рачных бабра і выдру. У светлы час сутак да гэтай даты можна паляваць на жывёл любога полу і ўзросту. Спосаб — хоць зброевы (у тым ліку з паляўнічымі сабакамі, з падыходу, з засады), хоць бяззброевы (з пасткамі, акрамя петляў, сачкамі, капканамі № 3-5), у тым ліку з паляўнічымі сабакамі. Па апошнюю нядзелю месяца дазволена паляваць на зайца-беляка, зайца-русака. На гэтую дзічыну можна паляваць зброевым спосабам, у тым ліку загонам. Па 31 студзеня працягнецца сезон здабычы андатры, амерыканскай норкі. Па апошнюю нядзелю студзеня аматары могуць паляваць і на звычайную вавёрку, гарнастая, лясную і каменную куніцу, ляснога тхара. У светлы час сутак дазваляецца здабываць жывёл любога полу і ўзросту зброевым спосабам з падыходу, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі, бяззброевым (з пасткамі (акрамя петляў), капканамі №0-3) спосабам.

Як заўважылі журналісту «Звязды» ў Міністэрстве лясной гаспадаркі, ніякіх змяненняў у сувязі з анамальнымі, не зусім зімовымі ўмовамі надвор'я не плануецца — усе паляванні будуць праходзіць у адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «НАФ-НАФ» З МЕДАЛЁМ

**ГОМЕЛЬСКІ мясакамбінат лідзіруе сярод аграпрамысловых прадпрыемстваў рэгіёна па колькасці заваяваных у 2011 годзе ўзнагарод.**

Як паведамілі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, прадукцыя прадпрыемства атрымала высокую ацэнку на прэстыжных спецыялізаваных выставах «Беларусь—Казахстан—Расія-2011», «Мясная індустрыя-2011», «ГУСТ-2011», «Лепшая прадукцыя года-2011». Залатыя медалі атрымалі адразу тры віды прадукцыі для харчавання дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту — каўбасы вараныя вышэйшага гатунку «Дзіцячая» і «Наф-Наф», а таксама сасіскі «Карапуз». Такой жа ўзнагародай ацэнена і каўбаса варана-вэнджаная салямі «Андрэеўская». Сярэбраныя медалі прадпрыемства атрымала за каўбаскі паўвэнджаныя «Княжыя» і каўбасу вараную «Мартадэла». Акрамя таго, прадпрыемства атрымала Гран-пры за стабільна высокую якасць на конкурсе «Лепшая прадукцыя года-2011».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Кватэрнае пытанне

# «ЗА ПЛАТУ... У ЧАСОВАЕ ВАЛОДАННЕ І КАРЫСТАННЕ»

***НЯДАЎНА пачулі, што прыняты новы Указ, у адпаведнасці з якім з 1 студзеня 2012 г. будзе выдзяляцца ўнаём жыллё камерцыйнага карыстання. Хто можа разлічваць на яго атрыманне?***

**С. КЛІМОВІЧ,**
*г. Гродна*

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8.11. 2011 г. № 512 сапраўды прадугледжана стварэнне фонду жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання з ліку свабодных (вызваленых) жылых памяшканняў мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў камунальным жыллёвым фондзе, а таксама іншымі дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі (у гаспадарчым падпарадкаванні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца жылыя памяшканні рэспубліканскага жыллёвага фонду) — у рэспубліканскім жыллёвым фондзе. Гэтымі ж органамі і арганізацыямі будзе вызначацца доля жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання адпаведнага дзяржжылфонду з улікам патрэбнасці ў такіх жылых памяшканнях і ажыццяўляцца ўключэнне іх у склад жылля камерцыйнага выкарыстання.

Жылыя памяшканні гэтага фонду прызначаюцца для выдзялення іх грамадзянам, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў і не стаяць на такім уліку, але не ў бестэрміновае карыстанне, а за плату ў часовае валоданне і карыстанне (на тэрмін, які не перавышае пяці гадоў). Гэтыя памяшканні не падлягаюць прыватызацыі, абмену, падзелу, продажу і здачы па дагаворы паднайму.

Інфармацыя пра наяўнасць такіх жылых памяшканняў і пра тэрмін звароту грамадзян па атрыманне на ўмовах адпаведнага дагавора найму павінна размяшчацца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, а таксама арганізацыямі, у гаспадарчым падпарадкаванні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца такія жылыя памяшканні, у даступных для азнаямлення месцах і інтэрнэце на афіцыйных сайтах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па месцы знаходжання гэтых жылых памяшканняў.

Указаны тэрмін звароту грамадзян не можа быць меншым за 15 каляндарных дзён з дня размяшчэння адпаведнай інфармацыі. Пасля заканчэння яго разглядаюцца заявы і выдзяляюцца жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання грамадзянам, якія маюць пераважнае права, стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў (у парадку чарговасці зыходзячы з даты пастаноўкі іх на ўлік). У выпадку адсутнасці заяў такіх грамадзян, жылыя памяшканні выдзяляюцца асобам, якія не стаяць на такім уліку (у парадку чарговасці паступлення заяў).

Тыповы дагавор найму жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду павінен быць зацверджаны Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 студзеня 2012 г.

Канкрэтны памер платы за карыстанне жылым памяшканнем будзе вызначацца зыходзячы з памеру базавай стаўкі платы за карыстанне такімі жылымі памяшканнямі (яна таксама павінна быць вызначана Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 студзеня 2012 г.) з прымяненнем каэфіцыентаў, якія вызначаюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам у залежнасці ад месца знаходжання жылых памяшканняў.

**Віктар САВІЦКІ.**

Факт

# Эфектыўныя металы

**У Магілёве на прыватным навукова-вытворчым прадпрыемстве «Тэхналіт» адкрыўся новы цэх механічнай апрацоўкі металаў. Чырвоную стужку перарэзаў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік, які вітае адкрыццё новых вытворчасцяў у рэгіёне.**

Гэта чарговы крок на кірунку замяшчэння імпартнай прадукцыі, які дазволіць «Тэхналіту» павялічыць аб'ёмы вытворчасці і, адпаведна, заробкі работнікам. У 2011 годзе сярэдні заробак на прадпрыемстве склаў 4 мільёны рублёў, а сёлета чакаецца яго далейшае павышэнне.

Для адкрыцця новага цэха «Тэхналіту» давялося давесці да ладу недабудаваны і закансерваваны будынак, закупіць сучаснае японскае абсталяванне. На праект выдаткаваны 4 мільёны еўра ўласных сродкаў прадпрыемства і крэдытных рэсурсаў. Пры выхадзе на праектную магутнасць у цэху будуць створаны 70 новых працоўных месцаў. Новую вытворчасць адрознівае энергаэфектыўнасць і прыбытковасць.

**Алена КАЗЛОВА.**

Кірмаш аддзел рэкламы ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376
штотыднёвы рэкламны выпуск № 50 (712)

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Кажух муж. натур. у добрым стане, памер 50—52, танна.
Тэл. 8 017 2082878, МТС 7921278.

❒ Новая гума да трактара МТЗ-82 ці абмен на заднюю.
Тэл. 8 033 6009101.

❒ Т-40 АМ з 2-восевым прычэпам, а/м «Аўдзі-А6» аўтамат, 140000 км, 1,9, колер пырскі шампанскага, 2000 г.в., тэлевізар.
Тэл. 8 029 9651517.

❒ Морква для корму ці абмен на з/ч да трактара.
Тэл. 8 033 3181016.

❒ Да трактара МТЗ: пускач, паршнявая, каленвал, галоўка. Усё новае ці абмен на іншыя з/ч.
Тэл. 8 033 3181016.

❒ Дзве дзіцячыя ўніверсальныя каляскі «Geoby», танна.
Тэл. 8 017 2757221.

❒ 2-пакаёвая кватэра ў Бабруйску па вул. 50 гадоў ВЛКСМ або абмен.
Тэл. МТС 7629768.

❒ Кацёл на цвёрдым паліве КСТ 12-31 кВт стальны ў Мінску.
Тэл. 8 029 7671112.

**КУПЛЮ**

❒ Тр-р МТЗ-1221, 80-82, Т-25, з/ч да іх, с/г агрэгаты.
Тэл. 8 033 3181016.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_______ №_____________ Выдадзены ____________________

Подпіс ___________________ Дата __________

# СТАРЭЙШЫНЕ ВЁСКІ — ПРЫЗ АД «ЗВЯЗДЫ»

**Жыхарка вёскі Арэшанкі Віцебскага раёна Валянціна Паўлаўна Логінава выйграла ў латарэі для падпісчыкаў «Звязды» параварку. Прыз стаў для яе цудоўным навагоднім падарункам ад любімай газеты, якую яна выпісвае некалькі дзясяткаў гадоў.**

— Нарадзілася я ў вёсцы Арэшанкі і жыву там па сённяшні дзень. У Сураж у школу хадзіла. Зараз мне 72 гады. З 1965-га ўвесь час працавала на пошце ў Задуброўскім аддзяленні сувязі аднайменнага сельсавета, — расказвае паважаная падпісчыца. — Працавала звычайным паштальёнам, потым прызначылі начальнікам, потым — зноў паштальёнам, і зноў начальнікам...

Валянціна Паўлаўна вельмі любіла сваю работу на пошце. Абслугоўвала адразу некалькі суседніх населеных пунктаў. І старалася, каб людзі былі задаволены. Як вынік, за пачэсную працу ад кіраўніцтва раённага вузла сувязі атрымлівала ганаровыя граматы і падарункі.

— «Звязду» пачала выпісваць, калі ўладкавалася на пошту. Вельмі добрая газета, — гаворыць пенсіянерка. — Падабаюцца публікацыі ў рубрыцы «Алё, народ на провадзе», спецыялізаваныя старонкі «Краіна здароўя», «Мясцовае самакіраванне».

Валянціна Паўлаўна з мужам летась адсвяткавалі залатое вяселле. Муж да выхаду на пенсію працаваў будаўніком. У іх пяцёра дзяцей, дзевяць унукаў і два праўнукі.

Не мог не запытаць пра жыццё ў вёсцы. Тым больш што Валянціна Паўлаўна — старэйшына.



— Вёска калісьці была вялікая. Ды хто з'ехаў, хто памёр. Тры дамы заселеныя засталіся. Тут мы з мужам жывём і яшчэ чатыры чалавекі. Шасцёра ўсяго! І яшчэ ў адным дамку — дачнікі, — не без жалю канстатуе старэйшына. — Пазбіралі, дарэчы, грошы — больш за мільён рублёў — агарадзілі за гэтыя грошы могілкі. І яшчэ збіраю грошы, каб надалей добраўпарадкоўваць вёску.

Паводле слоў Валянціны Паўлаўны, у вёсцы няма ні цэнтральнага водазабеспячэння, ні крамы. Добра, што аўталаўка прыязджае спраўна па графіку — раз у тыдзень.

— Калодзеж грамадскі трэба чысціць. Абяцалі камунальнікі гэта зрабіць, — працягвае жанчына. — Дарогу на Сураж падсыпалі, за што дзякуй дарожнікам. А вось прыпынак аўтобусаў толькі па патрабаванні. Дойдзеш да асфальту, чакаеш-чакаеш, а аўтобус не спыняецца. Не трэба нам дарогу асфальтаваць і прыпынак рабіць, проста хочацца, каб шафёр спыняўся, бо ў Суражы ў нас бальніца, аптэка, крама, царква. Можа трэба да старшыні райвыканкама звяртацца?.. А так — настрой добры. Пенсіі патроху дабаўляюць. Нам з мужам хапае: і адзетыя, і абутыя, ёсць ёсць што.

Ад імя ўсіх супрацоўнікаў рэдакцыі хочацца пажадаць паважанай Валянціне Паўлаўне, яе мужу, дзецям, унукам і праўнукам моцнага здароўя, поспехаў і аптымізму. І каб надалей «Звязда» заставалася іх памочніцай, дарадчыцай, сяброўкай.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Флікер ад Дзеда Мароза

**ГЭТЫМІ днямі ў Барысаве можна было пабачыць галоўнага героя навагодніх святаў, апранутага ў камізэльку інспектара ДАІ. У рамках акцыі «Бяспечныя канікулы» супрацоўнікі ўпраўлення ДАІ УУС Мінаблвыканкама пры падтрымцы вытворчага прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь» павіншавалі барысаўскіх дзяцей з зімовымі святамі, пры гэтым нагадалі малым удзельнікам дарожнага руху аб правілах бяспечных паводзін на дарозе.**

Як расказаў Мікалай Караткевіч, начальнік упраўлення ДАІ УУС Мінаблвыканкама, акцыя «Бяспечныя канікулы» накіравана на прадухіленне дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму. У Мінскай вобласці яна праходзіць з 19 снежня па 8 студзеня. Перад канікуламі ва ўсіх школах Міншчыны супрацоўнікі ДАІ правялі з дзецьмі гутаркі аб правілах дарожнага руху. Святочная акцыя ў Барысаве стала працягам «Бяспечных канікулаў».

З Мінска ў Барысаў разам з супрацоўнікамі ДАІ прыехаў Дзед Мароз. Вершы і песні, як звычайна бывае на традыцыйнай «ёлцы», пакінулі на потым. Падарункі, флікеры і навагоднія сувеніры дзеці маглі атрымаць, адказаўшы, як правільна пераходзіць вуліцу, з якога ўзросту можна ездзіць на месцы побач з вадзіцелем і на скутары, чаму небяспечна гуляць ля хуткаснай трасы. Аказалася, у правілах дарожнага руху барысаўскія школьнікі досыць дасведчаныя.



На канікулах дзеці часта застаюцца без пільнай увагі настаўнікаў і бацькоў. Лішак вольнага часу дазваляе ім трапляць у розныя непрыемнасці, у тым ліку малым пагражае і небяспека на дарозе. За 11 месяцаў гэтага года на дарогах Беларусі загінула 10 дзяцей. Як сведчыць статыстыка дарожна-транспартных здарэнняў, найбольш часта дзеці становяцца ўдзельнікамі ДТЗ з-за таго, што пераходзяць праезную частку ў неналежным месцы, не падпарадкоўваюцца сігналам святлафора і любяць нечакана выходзіць на дарогу (напрыклад, з-за аўтобуса), а вадзіцель машыны, што едзе міма, часта не паспявае спыніцца. Самымі небяспечнымі для дзяцей у плане рызыкі трапіць у бяду на дарозе лічацца выхадныя дні і час канікулаў.

**Ганна СЯРГЕЕВА.**

БЕЛМЕТАЛЛ

Первый и основной поставщик металлопроката

Оптовая и розничная торговля металлопрокатом, метизной продукцией и строительными материалами

- ТРУБЫ вгп, эл/св, проф, х/д, г/д, нержавеющие
- ЛИСТ г/к, х/к, оцинкованый
- АРМАТУРА кл AI, A III, A500C
- БАЛКА
- ШВЕЛЛЕР
- УГОЛОК
- КРУГ
- ШЕСТИГРАННИК
- КВАДРАТ
- ПОЛОСА
- ПРОВОЛОКА
- КАНАТЫ
- ЭЛЕКТРОДЫ СВАРОЧНЫЕ

Тел./факс в г. Минске 299-47-26, 346-22-06
Тел./факс в г. Бобруйске (8-0225) 43-26-10 моб. 8 044 7727125
Тел./факс в г.Гродно (8-0152) 56-07-85 моб. 8 044 7727113
Тел./факс в г.Орша (8-0216) 21-84-18, 21-83-38 моб. 8 029 1545949

Окажем услуги (017) 344-56-12 (017) 344-87-82
- Размотка, правка и резка бухтовой арматуры
- Рубка, гибка, резка металлопроката в размер
- Изготовление металлоконструкций по чертежам заказчика

ОАО «Белметалл», УНП 100055010
220075 г.Минск пр. Партизанский, 174 к.301
E-mail: belmetall@mail.by
www.belmetall.com

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 6 февраля 2012 года в 11.00 по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал.**
Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**Помещение в капитальном строении (здание блока вспомогательных помещений) общей площадью 79,6 кв.м по ул. Островского, 52, в г. Могилеве.** Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» - 3. Целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 696 500 рублей, размер задатка – 69 650 рублей.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049. Документы на участие в аукционе принимаются с **04.01.2012 по 03.02.2012** в рабочее время (с 8.00 до 17.00) по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные после 03.02.2012, рассматриваться не будут.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:
- перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- представляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:
- физическое лицо представляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- юридическое лицо: резидент Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица представляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Контактные телефоны: (8 0222) 29 21 33, 29 22 13, факс 22 54 58.**

## ГАДАВАЯ ЭКАНОМІЯ — МІЛЬЁН ДОЛАРАЎ

Электрычная падстанцыя ў пасёлку Мірадзіна Бабруйскага раёна адкрылася пасля рэканструкцыі. Гэтая падстанцыя забяспечвае энергіяй горад Бабруйск і шэсць бліжэйшых сельскіх раёнаў. У ліку прадпрыемстваў — буйныя Беларускі металургічны завод і «Белшына». Абсталяванне падстанцыі працавала больш за 50 гадоў і састарэла. На рэканструкцыю і мадэрнізацыю энергетыкі выдаткавалі 162 мільярды беларускіх рублёў, але выдаткі акупяцца за 15 гадоў: сучаснае абсталяванне, новыя тэхналогіі дазволяць эканоміць да мільёна долараў у год. Пасля абнаўлення значна павялічылася і надзейнасць працы падстанцыі для бесперабойнай падачы энергіі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Березинский сельский исполнительный комитет Березинского района Минской области (далее ПРОДАВЕЦ) проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Светлица

| № | Адрес земельного участка, кадастровый № | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Березинский район д. Светлица 620480407601000158 | 0,15 | Электроснабжение | 1266837 | 7147800 | 714780 |

** Примечание: земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.*

Задаток перечисляется на р/с № 3604060201908 в ЦБУ № 602 филиал № 612 АСБ «Беларусбанк» код 810, УНН 600040856, ОКПО 4431777.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому Лоту).

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 6 февраля 2012 года в 10.00 по адресу: г. Березино, ул. Ленинская, 4 (зал заседаний).

Заявление на участие и необходимые документы принимаются ежедневно (кроме субботы и воскресенья) до 17.00 по адресу: г. Березино, ул. Ленинская, 4 (кабинет управляющего делами).

**Контактный телефон: (8 01715) 5 55 81.**

Тэнгіз ДУМБАДЗЭ:

Гасцёўня

# «АМБІЦЫЙНАСЦЬ ПАТРЭБНА ТОЛЬКІ ТАМ, ДЗЕ ЯНА НЕАБХОДНАЯ»

**Хто ведае, не парві Тэнгіз Думбадзэ аднойчы свае вершы, можа, з яго атрымаўся б добры паэт. Вершамі беларускі грузін пачаў захапляцца яшчэ з дзяцінства: першая проба пяра адбылася ў сем гадоў. Сёння ён з настальгіяй узгадвае тую сваю словатворчасць, запісаную ў чатырох таўшчэзных сшытках у клетку, якія аднойчы, пакрыўдзіўшыся на нешта, ён узяў і знішчыў...**



**Тэнгіз ДУМБАДЗЭ — гісторык, палітолаг, журналіст. Па нацыянальнасці — грузін. Грамадзянства — беларускае. Нарадзіўся ў пасёлку Энергетыкаў Дзяржынскага раёна. Скончыў гістарычны факультэт БДУ. Мае двух сыноў. Жыве ў Мінску.**

У журналістыку Тэнгіз Думбадзэ прыйшоў не адразу. Спачатку былі думкі пра касманаўтыку (што лагічна ў сярэдзіне 60-х), затым захапленне футболам, потым — вучоба на гістфаку БДУ. Першы журналісцкі вопыт Тэнгіз атрымаў у Грузіі, дзе пэўны час узначальваў тэлеканал Аджарыі і быў неафіцыйным прэс-сакратаром Аслана Абашыдзэ.

— Калі мне прапанавалі пасаду на тэлебачанні, я згадзіўся, бо гэта заўсёды было маёй марай. Журналіст — гэта творчы чалавек, які мае магчымасць працаваць над вольнымі тэмамі. А вольныя тэмы я любіў заўсёды, — сцвярджае Тэнгіз.

**«Памятаю, як пасля той праграмы некаторыя асобы пачалі мяне абражаць. Але я казаў і кажу: няхай стане хто-небудзь з вас каля мяне і мы паглядзім, ці многія з вас здолелі б прайсці той жа шлях, які прайшоў я, бачачы войны, здрады і крывадушнасць, і застацца чалавекам?!»**

У Беларусі Тэнгіз Думбадзэ пачынаў як аўтар, вядучы і кіраўнік творчай групы праграмы «Дыханне планеты» на АНТ. Пазней — як сувядучы перадачы «Адкрыты фармат» на тым жа канале. Сёння журналіст засвойвае абавязкі кіраўніка Прадстаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь тэлеканала ТРА (Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы).

— Калі я, Тэнгіз Думбадзэ, адчуваю, што ў мяне як журналіста яшчэ ёсць порах, увесь свой патэнцыял я павінен засяродзіць на працы. Тым жа павінен займацца пісьменнік у літаратуры, а мастак — у мастацтве. Я лічу, якім бы чалавек living рознабаковым ні быў, ён павінен займацца адной справай, але рабіць яе на сто працэнтаў.

Прапановы адносна ТРА паступілі да мяне яшчэ напрыканцы мая, — удакладняе Тэнгіз. — І пакуль гэтае рашэнне выспявала, я абмяркоўваў нюансы з кіраўніцтвам АНТ — як быць з праграмай «Адкрыты фармат». У праект вырашыў не вяртацца — пасля было б немэтазгодна рэзка сыходзіць у сярэдзіне сезона. А вось працу над «Дыханнем планеты» я працягваю — пазаштатна.

Я вельмі люблю калектыў АНТ — ён шмат для мяне зрабіў у той напружаны момант, калі пасля палітычных падзей у Грузіі я вярнуўся ў Беларусь. Кіраўніцтва АНТ (Рыгор Кісель) аказала мне вялікі давер, таму рашэнне сысці з АНТ прымалася нялёгка.

Аднак тут планка яшчэ больш высокая. Я лічу, што на новай пасадзе я магу выйсці на яшчэ больш шырокае поле дзейнасці, як геаграфічнае, так і палітычнае — у межах Саюзнай дзяржавы. На новай пасадзе ў мяне з'явілася больш магчымасцяў прапагандаваць Беларусь за межамі нашай краіны.

## Пра сям'ю і традыцыі

Тэнгіз прызнаецца, што ў яго дзве радзімы — Беларусь (дзе нарадзіўся) і Грузія (дзе вырас). Бацькі і ўсе родзічы па бацькоўскай лініі жывуць у Батумі. Сам журналіст з сям'ёй — у Мінску.

— Цяжка жыць з сэрцам, якое дзеліцца на дзве часткі: паміж Грузіяй і Беларуссю, — прызнаецца журналіст. — Аднак у мяне душа аднолькава баліць як за адну радзіму — дзе я нарадзіўся, дзе выхоўваю сыноў і дзе ў мяне сям'я, — так і за другую.

***— Сыноў назвалі па-грузінску?***

— Так, старэйшы — Надар, а малодшы — Джаба. Калі б меншы сын нарадзіўся дзяўчынкай, то быў бы Ніно (*усміхаецца*. — **Аўт.**). Калі мая жонка была цяжарная, мы дамовіліся: калі будзе дачка, то імя выбіраю я. Зрабілі ўльтрагукавое абследаванне. Мне па сакрэце сказалі, што будзе дзяўчынка. Я ўжо і імя падрыхтаваў — Ніно (у гонар святой Ніны, якая прынесла ў Грузію хрысціянства, а таксама ў гонар Ніно Думбадзэ — першай алімпійскай чэмпіёнкі з Грузіі па кіданні дыска). Прыйшоў час нараджаць. Абвяшчаюць: Думбадзэ — дзяўчынка. Я ўзрадаваўся, думаў, у мяне нарадзілася. Аказваецца, там стаяў яшчэ нейкі Думбадзэ — жонка яму сёмую дачку нарадзіла... Праз дзесяць хвілін аб'яўляюць: Думбадзэ — хлопчык. Я агледзеўся, думаю, можа, яшчэ які мой цёзка ў радзільні ёсць. Спытаў, ці дакладна больш ніякіх Думбадзэ няма? Не, ніякіх памылак. А той Думбадзэ стаіць і кажа: «Давай памяняемся: табе — дзяўчынку, а мне — хлопчыка» (*смяецца*. — **Заўв. аўт.**).

***— Прозвішча «Думбадзэ» — распаўсюджанае ў Грузіі?***

— Так, сапраўды. Напрыклад, старэйшага сына я назваў у гонар майго славутага родзіча — празаіка Надара Уладзіміравіча Думбадзэ, «караля» грузінскага гумару.

***— Магчыма, вашы сыны таксама пададуцца ў журналістыку?***

— Пакуль не. Старэйшы вучыцца ў БНТУ, займаецца менеджментам, малодшы вучыцца на відэаінжынера, дапамагае мне пры мантажы рэпартажаў для «Дыхання планеты». З сынамі ў мяне сяброўскія адносіны, але сваю думку ім не навязваю. Стараюся даць ім самастойнасць. Мне самому самастойнасць у жыцці вельмі дапамагла — асабліва пры прыняцці важных рашэнняў. Бацькі жылі ў Батумі, а я пасля сёмага класа прыехаў да бабулі з дзядулем у Беларусь. Яны мяне і выхоўвалі. Што такое быць самастойным, зразумеў вельмі рана.

## «Тых, хто размаўляў на беларускай мове, лічылі калгаснікамі»

— Самай вялікай трагедыяй Беларусі я лічу яе моўны момант. Беларуская мова, як і любая мова, вельмі прыгожая.

**«Кожнага журналіста, які хоча стаць фокуснікам, я хачу папрасіць — задумайся, наколькі ты чысты перад сабою і перад сваёй сям'ёй. Наколькі праўдзіва тое, чым ты займаешся і да чаго заклікаеш...»**

Добрая, чыстая... Але сітуацыя, якую можна назіраць у Беларусі сёння, калі людзей, якія размаўляюць па-беларуску, можна пералічыць на пальцах, — гэта сапраўдная трагедыя.

Трагедыя, у якой глыбокія карані. Мы ж ведаем, што за ўсім гэтым стаіць наша трагічная гісторыя. Сусветныя войны, у якіх мы страцілі кожнага трэцяга БЕЛАРУСА. Узнаўлялі нашы гарады людзі з іншых рэспублік, для якіх беларуская мова не магла быць роднай, а тым больш першай. Такім чынам, міжэтнічнай стала ў нас руская мова. Памятаю сябе малым — тых, хто размаўляў у нас на беларускай мове, лічылі калгаснікамі. Гэта было абразліва.

У мяне была калісьці мара — хацеў вывучыць мову настолькі, каб умець свабодна гаварыць і на ёй выступаць. Але пабаяўся. Неяк прапанавалі весці канцэрт «Беларусь — гэта мы». Адной з умоў было веданне беларускай мовы, на якой трэба было весці канцэрт. Я адмовіўся. Вядома, я магу вывучыць тэкст слова ў слова, але любы, хто добра ведае мову, адразу распазнае фальш, штучнасць маёй мовы. Бо дзесьці скажу не так ці націск пастаўлю — і будзе сорамна. А беларуская мова павінна гучаць адшліфавана.

**«Можа, і нам варта так? Ставіць умовы. Адна з умоў — абавязковае веданне беларускай мовы. Але таксама будзе дзіўна, калі беларусы па-беларуску не змогуць сказаць ні слова, а ад выхадцаў з Азербайджана ці Мазамбіка мы будзем патрабаваць ведання беларускай мовы»**

## «Карэспандэнтам, якія рыхтуюць матэрыялы на беларускай мове, ганарары я плаціў бы ў 10 разоў большыя»

— Я пачынаю ганарыцца, калі чую, як размаўляюць на нашай мове. Беларускамоўныя сюжэты па тэлебачанні вітаю. Карэспандэнтам, якія іх рыхтуюць, я ганарар плаціў бы ў 10 разоў большы — каб іх прыклад быў «заразны».

У свой час, калі я працаваў на тэлебачанні Аджарыі, інфармацыйныя праграмы вяліся на васьмі мовах — мы ўдзялялі ўвагу любой этнагрупе, якая жыла тады ў рэгіёне. Перакананы, што сёння такі падыход неабходны ва ўсіх кутках свету.

Вы можаце такое ўявіць: я хачу стаць грамадзянінам Расіі, але буду ігнараваць рускую мову? Гэта смешна. А чаму тады аналагічная сітуацыя ў іншай рэспубліцы ўспрымаецца нармальна?

Можа, і нам варта так? Ставіць умовы. Адна з умоў — абавязковае веданне беларускай мовы. Але таксама будзе дзіўна, калі самі беларусы па-беларуску не змогуць сказаць ні слова, а вось ад выхадцаў з Азербайджана ці Мазамбіка мы будзем патрабаваць ведання беларускай мовы. Абсурд!

Няма патрыятызму, а ён павінен заключацца ва ўсім. Тыя ж прыбалтыйскія краіны, якія паставілі пытанне рубам — каб кожны грамадзянін ведаў нацыянальную мову? Памятаеце, мітынгі былі?

***— Калі б чыноўнікаў абавязалі здаваць экзамен па беларускай мове, ці падтрымалі б вы гэтую прапанову?***

— Цяжка сказаць. Не хачу, каб мой адказ быў папулісцкім, маўляў, як патрыёт я падпішуся.

Я ж ужо казаў, што мне і самому цяжка будзе гаварыць па-беларуску. Можа быць, якую-небудзь іншую форму знайсці? Экзамены — рэч няўдзячная. Камусьці пашанцавала — білет лёгкі выцягнуў, а камусьці цяжкі білет. Я не падпісаўся б, але распісаўся б з прапановай: мову павінны ведаць усе, тым больш — беларускія чыноўнікі.

## «Журналістыцы не хапае прынцыповасці»

***— Як вы ацэньваеце негатыўныя выказванні ў ваш адрас пасля выхаду ток-шоу «Выбар» 19 снежня 2010 года?***

— Я ніколі не займаўся папулізмам. Памятаю, як пасля той праграмы некаторыя асобы пачалі мяне абражаць. Але я казаў і кажу: няхай стане хто-небудзь з вас каля мяне, і мы паглядзім, ці многія з вас здолелі б прайсці той жа шлях, які прайшоў я, бачачы войны, здрады і крывадушнасць, і застацца чалавекам?!

У інтэрнэце пра мяне таксама напісалі. Але хто піша? Або тыя, хто вечна незадаволены жыццём — зайздроснікі або лайдакі, якім няма чым заняцца. Мяне ж выхоўвалі інакш: любіць радзіму і даражыць бацькамі. Самае страшнае — здраджваць. Калі ты здрадзіў аднаму са сваіх ідэалаў — гэта ганьба. І сваіх дзяцей спрабую выхоўваць у тым жа духу. Я ганаруся, што жыву без ганьбы. Прынамсі, нармальны чалавек мяне не папракне, а што датычыць ненармальнага, то Бог ім усім суддзя...

***— Як вы лічыце, чаго сёння не хапае беларускай журналістыцы?***

— Пытанне складанае. Я ж сам знаходжуся ў гэтым асяродку. Журналісты — людзі вельмі амбіцыйныя. Можа, яна і патрэбна — гэтая амбіцыйнасць. Аднак мая просьба, мой зварот да ўсіх журналістаў: амбіцыйнасць патрэбная толькі там, дзе яна неабходная. Усёдазволенасці быць не павінна. Чаму я ў «Дыханні планеты» адчуваю сябе, як у сваёй талерцы? Наша галоўная задача — не сваё бачанне, а тое, як усё ўспрымаецца людзьмі краіны, з якой вядзецца рэпартаж.

А вось чаго не хапае — гэта прынцыповасці. Мы павінны вельмі асцярожна і ўзважана падыходзіць да сваёй працы і даражыць кожным словам. У журналістыцы гэта вялізная сіла. Нас называюць чацвёртай уладай. Паверце, часам мы можам быць і другой. Я бачыў, як дзякуючы журналістыцы ў многіх краінах адбываліся рэвалюцыі.

Некаторыя журналісты так адкрыта хлусяць, так шчыра могуць падпісацца за якуюсьці хвілінную выгаду — усё гэта ўжо адбывалася на маіх вачах у Грузіі. Улада дзейнічае на людзей, як гіпноз. Кожнага журналіста, які хоча стаць фокуснікам, я хачу папрасіць: задумайся, наколькі ты чысты перад сабою і перад сваёй сям'ёй. Наколькі праўдзіва тое, чым ты займаешся і да чаго заклікаеш...

**Ілья ЛАПАТО.**
**Фота з архіва Т. Думбадзэ.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### строительства многофункционального комплекса с предприятиями торговли, общественного питания, бытового обслуживания № 10 (по генплану) по ул. Янковского – Горецкого – Проектируемая

**Застройщик:** Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. Тел. 8 (017) 216 00 09.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства, были построены следующие объекты:

в 2009 году:

жилой дом № 11Д по ул. Высокая в г. Минске;

в 2010 году:

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске

в 2011 году:

жилой дом № 37А по ул. Бумажкова в г. Минске, жилой дом № 10 по ул. Нововиленская в г. Минске.

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства** – строительство многофункционального комплекса с предприятиями торговли, общественного питания, бытового обслуживания № 10 (по генплану) по ул. Янковского – Горецкого – Проектируемая.

Строительством предусмотрено выделение пусковых комплексов:

- жилая часть – 19-этажный жилой дом № 10 по генплану (1-ый пусковой);
- встроенно-пристроенные помещения административно-общественного назначения с объектами торговли, общественного питания и бытового обслуживания № 10 по генплану (2-ой пусковой).

**Застройщиком получены:**

- заключение Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома № 02-28/19Ф от 28.02.2011 г.;
- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза по городу Минску») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 410-60/11 от 31.05.2011 г.;
- решения Минского городского исполнительного комитета № 905 от 07.04.2011 г., № 1963 от 14.07.2011 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- договор аренды земельных участков с кадастровыми номерами 500000000006006265 – 500000000006006271;
- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-038/11 от 20.10.2011 г.

Начало строительства – октябрь 2011 года, предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – октябрь 2013 года.

Многофункциональный комплекс представляет собой: жилая часть – 19-20-этажное здание, и пристроенно-встроенные помещения административно-общественного назначения и встроенно-пристроенным объемом, расположенном в зоне цокольного этажа с размещением в нем помещений административно-общественного назначения, общественного назначения и общественного питания.

**Жилая часть комплекса:** расположена в зоне жилой застройки на пересечении улиц Янковского – Горецкого – Проектируемая. Проектом предусматривается строительство 126-квартирного, односекционного, 19-20-этажного жилого здания в монолитном каркасе, с подвалом и частично с техническим этажом. Наружная отделка – декоративная полимерная штукатурка, покраска фасадными красками. Оконные блоки двухкамерные стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. В помещениях квартир чистовая отделка и покрытие пола проектом не предусматривается. Жилая часть комплекса оборудована 2 лифтами, мусоропроводом. На первом этаже и в подвале – встроенно-пристроенные помещения общественного назначения, технологические и технические помещения. В пристраиваемой части цокольного этажа – повысительная насосная станция; в подвале, расположенном под жилым домом, предусмотрено частичное размещение производственных и служебно-бытовых помещений кафе.

**Пристроенно-встроенная часть комплекса:** пристроенные помещения расположены в цокольном этаже, на кровле которого размещается открытая автостоянка, встроенные помещения расположены частично в подвале жилого дома. В пристроенных помещениях – помещения общественного назначения, приемный пункт прачечной и химчистки, в пристроено-встроенных помещениях – кафе с производственными, складскими, служебно-бытовыми помещениями.

Помещения в комплексе, не входящие в состав общего имущества комплекса: пристроенно-встроенная часть комплекса, встроенно-пристроенные помещения общественного назначения, расположенные в подвале и на первом этаже жилой части комплекса и объекты, которые служат для использования этих помещений (коридоры, тамбуры, санузлы и подсобные помещения).

**В состав общего имущества в многофункциональном комплексе, которое будет находиться в общей долевой собственности**, после ввода в эксплуатацию жилой части комплекса и передаче дольщикам объектов долевого строительства, входят:

помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерные узлы); коридоры общего пользования, лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные незадымляемые балконы, лифты, тамбуры, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки.

**Генеральный подрядчик по объекту строительства ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда № 27-05/7 от 10.06.2011 г. Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц 1-, 2-, 3-, 4-комнатные квартиры.**

Стоимость 1 кв. метра эквивалентна 940 (девятисот сорока) долларам США

**Ознакомление дольщиков с планировками квартир,** предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу: г. Минск, проспект Победителей, д. 89, кор. 2, помещение 10, каб. 18, 41. **Тел. 8 (017) 216 00 09. *Официальный сайт www.airon.by***



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### 19-этажный односекционный жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения в комплексе с временной охраняемой автостоянкой по ул. Карвата в Степянке

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09.***

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства, были построены следующие объекты:

в 2008 году:

жилой дом № 26 по ул. Игуменский тракт в г. Минске;

в 2009 году:

жилой дом № 11Д по ул. Высокая в г. Минске;

в 2010 году;

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске (1 пусковой комплекс).

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства** – строительство 19-этажного односекционного жилого дома со встроенными объектами торгово-общественного назначения в комплексе с временной охраняемой автостоянкой по ул. Карвата в Степянке.

Строительство осуществляется с выделением следующих этапов:

первая очередь строительства: жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения (жилая часть – первый пусковой комплекс, встроенные объекты торгово-общественного назначения – второй пусковой комплекс);

вторая очередь строительства: временная охраняемая автостоянка.

Начало строительства – первый квартал 2011 года, окончание строительства жилой части – 2 квартал 2012 года.

**Застройщиком получены:**

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – акт выбора земельного участка от 13 июля 2010 года, утвержден председателем горисполкома 14 июля 2010 года;
- заключение Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома № 01-25/3 Пт от 25.01.2010 г.;
- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза по городу Минску») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 1333-60/10 от 30.11.2010 г.;
- положительное заключение комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома № 04-15/36Пт от 15.04.2011 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета № 81(1) от 20 января 2011 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- свидетельство (удостоверение) № 500/726-7126 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000001005378, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Карвата, площадью 1,0220 га, на период строительства многоэтажного жилого дома;
- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-205Ж-002/11 от 31.03.2011 г.

**Жилой дом** расположен по улице Карвата в микрорайоне Степянка г. Минска (первая очередь). Проектом предусматривается строительство 126-квартирного, односекционного, 19-, 20-этажного жилого дома, со встроенными помещениями торгово-общественного назначения. Несущие конструкции здания запроектированы в монолитном железобетонном каркасе, ограждающие конструкции – из мелкоштучных блоков ячеистого бетона, кровля совмещенная рулонная. Наружная отделка – декоративная полимерная штукатурка, покраска фасадными красками. Оконные блоки – двухкамерные стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. В помещениях квартир чистовая отделка и покрытие пола проектом не предусматривается. Жилой дом оборудован 2 лифтами, мусоропроводом.

Помещения в доме, не входящие в состав общего имущества: помещения торгово-общественного назначения и объекты, которые служат использованию этих помещений (коридоры, тамбуры, санузлы и подсобные помещения).

**В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности**, после ввода в эксплуатацию жилого дома и передаче дольщикам объектов долевого строительства, входят:

помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); межквартирные лестничные клетки, коридоры общего пользования, лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные незадымляемые балконы, лифты, тамбуры, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, две открытые парковки на 19 и 15 машино-мест.

Стоимость строительства открытой охраняемой автомобильной стоянки на 58 машино-мест не включается в стоимость 1 кв.метра стоимости жилого дома и не передается дольщикам в качестве имущества совместного домовладения.

**Генеральный подрядчик по объекту строительства ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда № 3-11 от 19.01.2011 г. Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 1-, 2-, 3-, 4-комнатные квартиры для граждан, состоящих и не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц.**

Стоимость 1 кв. метра эквивалентна 920 (девятисот двадцати) долларам США.

**Ознакомление дольщиков с планировками квартир**, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу: г. Минск, проспект Победителей, д. 89, кор. 2, помещение 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09. Официальный сайт www.airon.by***


Ведай нашых!

# САМЫ ВЫСОКІ Ў СВЕЦЕ — БЕЛАРУС!

**ГЭТАГА чалавека, які нарадзіўся недалёка ад Віцебска, безумоўна, ведаюць ва ўсім свеце. Хоць, можа, і не адразу ўспомняць яго прозвішча. Калі б ён быў нашым сучаснікам, адназначна быў бы занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса.**

У сярэдняй школе вёскі Старое Сяло Віцебскага раёна, якой ужо больш за 155 гадоў, ёсць унікальная экспазіцыя. У прыватнасці, ложак даўжынёй 2 метры 65 сантыметраў, шырынёй — 1 метр 20 сантыметраў. Але ж і гэтага было мала ўладальніку названай «канструкцыі». Адпачываў на ложку такіх гіганцкіх памераў легендарны велікан Фёдар Андрэевіч Махноў, які родам з гэтых мясцін. У яго ботах лёгка хаваліся малыя дзеці, бо ступня Махнова была даўжынёй болей за 50 сантыметраў. Дзяцей ён вельмі любіў (цукеркі дарыў ды розныя сувеніры рабіў з падкоў), любіў і ўсіх людзей наогул, мог пажартаваць «па-веліканску» з тых, хто жартаваў з яго.

Гэты чалавек, як сведчаць самыя розныя крыніцы, быў вышынёй 2 метры 85 сантыметраў, а вагой — за 180 кілаграмаў! Нарадзіўся ён летам 1878 года на хутары каля вёскі Касцюкі (цяпер мае народную назву Веліканаў хутар), што недалёка ад Старога Сяла. Памёр велікан у 1912-ым. Быў пахаваны на сваёй малой радзіме. Цудам, дарэчы, захаваўся надмагільны помнік, на якім ёсць звесткі пра яго неверагодны рост.

Але ж, як упэўнены тутэйшыя краязнаўцы, рост, указаны тут (калі перавесці аршыны і вяршкі ў знаёмыя нам адзінкі вымярэння, атрымаецца 254 сантыметры) няправільны, бо такім Махноў быў толькі ў юнацтве. А дарэвалюцыйныя эксперты настойвалі менавіта на 285 сантыметрах. І гэта пацвярджаюць публікацыі часопісаў і газет тых, ужо далёкіх, часоў.

У школьным музеі беражліва захоўваюцца тысячы экспанатаў, якія прысвечаны краязнаўству. Душа і муза, заснавальніца музейнай экспазіцыі Маргарыта Юшкевіч па адукацыі — настаўнік гісторыі і геаграфіі. Гадамі яна перапісвалася з самымі рознымі навуковымі і музейнымі ўстановамі, у тым ліку і замежнымі. Як і з нашчадкамі Махнова, якія жывуць у розных краінах.

Фёдар Махноў з жонкай.



Як стаў вядомым на ўвесь свет вясковы хлопчык, які ў цяжкіх справах людзям дапамагаў, на пана працаваў? Ёсць звесткі пра тое, што ў жніўні 1898-га, калі сяляне з Касцюкоў, у тым ліку і велікан, прыехалі ў Віцебск гандляваць яблыкамі, пра вельмі высокага хлопца расказалі ўладальніку цырка, які тут гастраляваў. У выніку наш зямляк аб'ехаў шмат краін, жыхароў якіх вельмі здзіўлялі яго рост і сіла.

Французскі біёлаг Жан Растан у кнізе «Жыццё» паведамляе, што вясной 1905 года за мяжой пабываў гігант Махноў. Рост яго... 2,85 метра, вага 182 кілаграмы. Даўжыня яго далоні — 32 сантыметры, а ступні — 51 сантыметр.

Падчас замежных гастроляў беларускі велікан сустракаўся і з каралямі, і з вышэйшымі духоўнымі асобамі. І зарабіў некалькі тысяч рублёў — для селяніна ў той час сума неверагодная. А па іншых звестках, і не вельмі вялікія грошы прывёз дадому, бо падманвалі яго тагачасныя «прадзюсары». Таму потым зноў паехаў гастраляваць, але ж ужо як чалавек сямейны.

Яго каханая жонка, мясцовая настаўніца Ефрасіння Лебедзева была значна ніжэйшая, але ж... крыху вышэйшая за два метры. Нарадзіла яна яму трох сыноў і дзвюх дачок... Сталі яны, калі выраслі, высокімі — баскетбалісты б пазайздросцілі, але не веліканамі (ростам каля двух метраў).

Ад чаго дакладна памёр Махноў, невядома. Самая верагодная версія: чысціў неаднойчы рэчку Заронаўку ад камянёў, ды ногі хварэлі яшчэ з дзяцінства, а незадоўга да смерці часта прычынялі пакуты лёгкія... У 1930-я, калі яго сын Радамір вучыўся на медыка ў Мінску, стала вядома, што ён сын таго самага Махнова. Прапанавалі яму прадаць шкілет бацькі. Удава пагадзілася на гэта за пяць тысяч рублёў. (Для параўнання, хлеб тады каштаваў капейкі.) Шкілет вывучалі ў Акадэміі навук. Куды ён знік, падчас акупацыі Мінска фашыстамі, — невядома.

На жаль, пакуль што не стаў Веліканаў хутар меккай для турыстаў. А, напэўна, знайшлося б шмат ахвотных прыехаць сюды. Нават у Віцебску, ад якога рэгулярна ў Старое Сяло курсіруе грамадскі транспарт, не ўсе ведаюць пра гэты беларускі цуд. Ёсць чым заняцца турыстычным фірмам.

Паднавіць бы помнік ды зноў даць хутару жыццё... У выніку на Віцебшчыне магла б з'явіцца ўнікальная турыстычная зона ў гонар памяці аб самым высокім чалавеку ў свеце. Таго ж славутага Мюнхгаўзена, напрыклад, вельмі шануюць землякі. Ды і грошы зарабляюцца на яго імені. І мы маглі б атрымліваць дывідэнды, дзякуючы стварэнню «веліканскай» інфраструктуры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

### МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

**Заданне № 9**



**Белыя**: Крb8, Фf7, Cd3, Kd8, Kg8, пп. e3, f3 (7).

**Чорныя**: Крe5, Фh1, Лg2, Лh7, Ca8, Kd5, Kg7, пп. b3, c5, c6, h2, h6 (12).

Мат за 4 хады.

**Заданне № 10**



**Белыя**: Крg5, Фa6, Лe1, Лh6, Ca2, Cc5, Ke6 (7).

**Чорныя**: Крe5, Фe4, Лd5, Ke8, п. g6 (5).

Мат за 2 хады.

Чакаем вашых адказаў.

### ПРАВЕРЦЕ СВАЕ АДКАЗЫ

Змяшчаем рашэнні заданняў № 5 і № 6 масавага конкурсу, апублікаваных 6 снежня 2011 г.

Заданне № 5 (3 ачкі). К. Баер (1858 г.) Белыя: Крb7, Фf2, Ch4, пп. a3, c4, d3 (6). Чорныя: Крc5, Cd2, Ka2, Kd4, пп. b6, d6 (6). Мат за 3 хады.

1. Фe3 — пагроза 2. Фe5+ de 3. Ce7x. 1... C:e3 2. Cd8 d5 3. Ce7x. Хады 1... Kb4 або 1... Kc3 не абараняюць ад пагрозы 2. Фe5+. Дрэнна 1. Фf7 Ke6! і 1. Фg2 Kf3!

Заданне № 6. (3 ачкі). Э. Аладар (1906 г.) Белыя: Крe5, Лa7, Cd8, Ka4, Kc6, п. f2 (6). Чорныя: Крb5. Мат за 3 хады. 1. Ca5!, пасля чаго чорны кароль вымушаны «плыць па цячэнні» ў трох такіх варыянтах: 1... Кр:a4 2. Kd4 Крa3 3. Cc3x, 1... Кр:c6 2. Kc3 Крc5 3. Лc7x, 1... Крc4 2. Kd4 Крd3 3. Kb2x.

Правільна рашылі заданні наступныя ўдзельнікі: Віктар Быкаў, Сяргей Гурыновіч, Анатоль Дарашэнка, Васіль Зелянкоўскі (усе — Мінск), Міхаіл Клешч (Навагрудак), Іван Козел (Мазырскі р-н), Альберт Літвінаў (Мінск), Аляксандр Маджара (Рэчыца), Сяргей Пунько (Мінск) і іншыя.

Прыводзім адказы на задачы, апублікаваныя 24.08.2011 г. Двуххадоўка рашаецца ходам 1. Фh8! Зваротны мат за 3 хады рашаецца наступным чынам: 1. Cg8! — цугцванг. 1... Крf4 2. Kg7+Крg4 3. Крb1 1... Kc3 2. Kh4+Крd4 3. Kf3 — 3. K:f3x, 1... Kd2 2. Kg3+ Крd4 3. Ke2 — K:e2x, 1... Kf3 2. Kb5+ Крe4 3. Kc3 K:c3x, 1... Ke2 2. Kc4+ Крe4 3. Kd2 — Kxd2x

